ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

ЛЮТЫ 16 1933 г.

№ 37 (4581)

Год выданьня XVI

Сеньня у нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Насеньне — важнейшае зьвяно падрыхтоўкі да сяўбы. Ул. Мяжэвіч — Лепельская МТМ у палоне шкоднікаў (1 стар.).

АБ ДАГАВОРНАЙ КАМПАНІІ ПАМІЖ МТС І КАЛГАСАМІ — Пастанова ЦК КП(б)Б (1 стар.).

АБ КАРМОХ — З пастановы Цэнтрпасеўкому ЦК КП(б)Б (1 стар.).

ПАВЫШЭНЬНЕ ЎРАДЖАЙНАСЬЦІ — ЦЭНТРАЛЬНАЯ ЗАДАЧА — З выступленьня тав. Бэнзка на IV сэсіі ЦВК БССР (2 стар.).

Поўнасьцю ссыпаным і ачышчаным насеньнем, добраякасна адрамантаваным трактарам сустрэць бальшавіцкую вясну (1 стар.).

Яшчэ няма рашучага зруху ў разгортваньні дзяржаўнай закупкі збожжа (2 стар.).

Разьбіць злачынныя дэмабілізацыйныя настроі на фронце ільнасеяньня па Сененскім і Мсьціслаўскім раёнах (3 стар.).

ЗА МЯЖОЙ:

Абвастраньне нямецка-францускіх супярэчнасьцяй (4 стар.).

Гітлер патрабуе звароту карыдору (4 стар.).

Рэзкія выпады польскае прэсы супроць Гітлера (4 стар.).

Поўнасьцю ссыпаным і ачышчаным насеньнем, добраякасна адрамантаваным трактарам сустрэць бальшавіцкую вясну

Моцнай працоўнай дысцыплінай, цьвёрдым бальшавіцкім кіраўніцтвам калгасамі забясьпечым поўную гатоўнасьць да выхаду у поле

шырэй разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва ў калгасах, бязьлітасна ўдарыць па кулаку, шкодніку і іх агентах!

Насеньне—важнейшае зьвяно падрыхтоўкі да сяўбы

Адным з асноўных зьвеньняў пасьпяховай падрыхтоўкі да веснавой сяўбы зьяўляецца **НАСЕНЬНЕ.** Да гэтага зьвяна павінна зараз быць прыкавана ўвага ўсіх партыйных арганізацый, усёй пралетарскай грамадзкасьці як вёскі, так і горану. Збор насеньня зьяўляецца помітычным экзамэнам для партыйных і савецкіх арганізацый у іх падрыхтоўцы да сяўбы, зьяўляецца паказальнікам таго, наколькі яны паленныя кіраўніцтва сельскай гаспадаркай адпаведна з новымі ўмовамі і новай абстаноўкай у вёсцы.

Якое становішча са ссыпкай насенных фондаў у нас у БССР? Апошні тэрмін ссыпкі мінуў месяц таму назад. І вось, ня гледзячы на спазьненьне на цэлы месяц, мы **ня выканалі пляну ссыпкі насеньня ні па адной культуры. За апошні час тэмпы ссыпкі насеньня зусім аслаблі.** Рад раёнаў весь ужо на працягу тыдня амаль зусім спынілі ссыпку.

Возьмем насенне збожжавых культур. Ніякіх аб'ектыўных прычын, каб затрымліваць ссыпку, няма. Між тым такія раёны, як **Сіроцінскі, Крупскі, Горацкі, Веткаўскі, Дзяржынскі, Лагойскі** і інш., за апошнія 5 дзён ня ссыпалі ні аднаго кілёграма. Сабраўшы 70-80 проц. насеньня, гэтыя раёны супакоіліся і праўляюць паўнейшую бесклопотнасьць і спакой да ссыпкі насеньня.

Найбольшае адставаньне мы маем у ссыпцы насеньня тэхнічных культур, асабліва ільну. Прычым найбольш адстаючымі зьяўляюцца **ільнасодчыя раёны,** якія сабралі толькі 60 проц. насеньня ільну, гэтай вядучай культуры.

Даволі сказаць, што такія раёны, як **Расонскі, Полацкі, Асьвейскі, Лепельскі, Сеньненскі, Шклоўскі, Сіроцінскі, Бешанковіцкі, Гарадоцкі** і інш., за апошнія 5 дзён не сабралі ні аднаго кілёграма ільнанасеньня.

Тут мы глядзім яўна **кулацкае супраціўленьне** сацыялістычнай спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі. Асабліва выразна гэтыя антыільнаводчыя тэндэнцыі праяўляюцца ў **Талачынскім, Лепельскім, Расонскім і Мсьціслаўскім** раёнах. Тут кулацтва ідзе на ўсё, каб толькі ня сеяць ільну. Пад лён адводзяцца самыя горныя землі, ільну не даглядаюць, ільнанасеньне адводзіцца ў якасьці «сустрэчных пляноў», сёчыста не пакідаецца для засеву, каб толькі давесьці, што «на нашай глебе лён ня родзіць».

Зараз кулацтва вядзе падрыўную работу на разбазараваньні насеньня ільну. Замест ільну ссыпаюць іншыя культуры. Горш за ўсё тое, што рад арганізацый на мясцох не заўважваюць манэўраў клясавага ворага, часта ідуць у яго на поваду, напрыклад, у Талачынскім раёне.

Нельга прайсьці мімо таго, што афіцыяльныя даныя многіх райземаддзелаў аб ссыпцы насеньня часта не адпавядаюць сапраўднасьці. Перш за ўсё сьпікным мы можам лічыць тое насеньне, **якое поўнасьцю ачышчана.** Аб гэтым ЦК КП(б)Б і СНК БССР сказічасова папярэдзілі раённыя арганізацыі. У сапраўднасьці-ж у большасьці раёнаў ачыстку насеньня амаль не пачынялі. Паводле даных Наркамзему на 10 лютага плян ачысткі насеньня па рэспубліцы выканан ня больш чым на 15 проц. Такім чынам мы маем зусім натуральнае зьніжэньне ссыпкавых насенных фондаў ад 10 да 15 проц. Аб гэтым перш за ўсё павінны памятаць раённыя арганізацыі, райземаддзелы і сельсаветы, калі яны складаюць зводкі аб ссыпцы насеньня.

Нарэшце, факты апошніх дзён у радзе раёнаў гавораць аб тым, што пры праверцы ў некаторых калгасах аказваецца ссыпана менш насеньня, чым яны паведамляюць сельсаветам. Тут мы маем справу з яўным уціраньнем вачэй, ашуканьнем партыі і пралетарскай грамадзкасьці. ЦК КП(б)Б і СНК БССР зноў такі сказічасова папярэдзілі раённыя арганізацыі аб тым, што насенне мы можам лічыць ссыпаным толькі пасьля таго, як райвыканкомы і сельсаветы самі ў гэтым упэўняцца, **зрабіўшы праверку ў кожным саўгасе і калгасе,** толькі пасьля таго, як мясцовыя арганізацыі самі ўпэўняцца, што насенне поўнасьцю ссыпана, ачышчана і перадана пад расьпіску на хаваньне надзейным, адданым партыі і савецкай уладзе людзям.

Вакол збору насеньня адбываецца жорсткая клясавая барацьба. Клясавы вораг прыкладае ўсе сілы, каб сабатаваць ссыпку насеньня, каб сарваць сяўбу тэхнічных культур. Наша задача растлумачыць шырокай масе калгаснікаў, што аб насеньнай пазыцыі з боку дзяржавы ня можа быць і гутаркі. Кожны калгас павінен **САМ** паклапаціцца аб насеньні. Разам з растлумачальнай работай неабходна там, дзе трэба, ужыць і адміністрацыйныя меры ўзьдзеяньня. Разбазараванае насеньне трэба зараз-жа вярнуць у калгасныя сьвірны. **Насеньне можа і павінна быць ссыпана поўнасьцю ў самыя бліжэйшыя дні адпаведна з пасеўнымі плянамі.**

Мы ня можам выпускаць з-пад увагі і адзіноасобны сэктар, які займае ў БССР яшчэ даволі значнае месца. Усе адзіноасобныя гаспадаркі ў гэтым годзе атрымліваюць цьвёрдыя пасеўныя пляны, якія павінны быць імі выкананы ў парадку самаабавязацельстваў. Кожны адзіноасобнік ужо зараз павінен ссыпаць насенныя і страхавыя фонды, выдаўшы дзяржаве расьпіску аб тым, што ён захавае насеньне да весны. Афармленьне гэтых расьпісак кожнага адзіноасобніка ў паасобку — баявая задача сельсаветаў, органаў пралетарскай дыктатуры на вёсцы.

Нарэшце, аб ачыстцы і пратручваньні насеньня. У барацьбе за ўраджай вялікае значэньне мае мерапрыемствы па ачыстцы палёў ад пустазельля. Пустазельле кожны год зьмяншае ўраджай галоўнейшых азімых і яравых культур ад 25 да 30 проц. Пустазельле вельмі хутка размнажаецца і зьмяншае колькасьць вільгаці ў глебе, зьніжае ўраджай. Адным з мер барацьбы з пустазельлем зьяўляецца ачыстка насеньня.

Трэба зараз-жа максімальна скарыстаць усе сартавочныя і збожжаачышчальныя машыны з такім разьлікам, каб у бліжэйшыя дні закончыць сартаваньне і ачыстку насеньня. Разам з гэтым трэба правесьці поўнае сухое пратручваньне насеньня, заражанага галаўнёй.

Барацьба за ўкараненьне агратэхнікі ў сельска-гаспадарчую вытворчасьць, барацьба са стратамі — гэта разам з тым барацьба за сацыялістычныя адносіны да грамадзкай уласнасьці, да выкананьня абавязкаў перад дзяржавай і за ўсямернае ўмацаваньне калгасаў.

Толькі рашуча зьмятаючы са шляху кулацкае ахвесьце, перамагаючы апартуністычны слякоцкі, зьнішчаючы ўсякія спробы кулацтва сарваць нашу барацьбу за своячасовы збор і ачыстку насеньня, мы выканаем важнейшую задачу падрыхтоўкі да першай вясны другой пяцігодкі.

Сакрэты райземаўскіх зводак

ЛЕПЕЛЬ. (Ад нашага спэцкора). Афіцыяльныя зводкі Лепельскага райзаведамляюць аб тым, што плян ссыпкі насеньня збожжавых культур выканан на 103 проц. Але правільнасьць гэтай лічбы трэба ўзяць пад вялікае сумненьне.

Калгас **«Чырвоная зорка»** паведаміў у сельсавет і райвыканком, што насенныя фонды ссыпаны поўнасьцю. Але неяк выпадкова праверылі. І гэта самая «Зорка» перастала сьвяціць, згасла ў сваім «очковтирательском» запале. У сьвірнах не хапала 600 пудоў «ссыпанага насеньня». Тут-жа высьвятлілася, што яго ніколі ня ссыпалі ў такіх разьмерах, як паказалася ў зводках. Ёсьць усе падставы меркаваць, што такія факты маюць месца і ў іншых калгасах, бо са 120 калгасаў праверка насенных фондаў праведзена толькі ў 16-ці.

Асабліва дрэнна са ссыпкай насеньня ільну. Раён нават і на палову не забясьпечыў насеньнем плошчу пад тэхнічнымі культурамі. Зараз выяўляецца, што рад буйнейшых ільнаводчых калгасаў пад упывам кулацкай агітацыі здалі ў часе загатовак звыш пляну па некалькі дзесяткаў цэнтн. ільнасемя (калгасы «Чырвоная зорка», «Чырвоная Прыбойшчына»), каб скарапіць пасеўныя плошчы пад ільном. Гэты факт паказвае наколькі моц на яшчэ ў раёне кулацкае супраціўленьне сяўбе ільну, наколькі моцны антыільнаводчыя настроі. **Раённыя арганізацыі своячасова не далі адпору гэтым антыільнаводчым тэндэнцыям.**

Яшчэ горш з падрыхтоўкай да сяўбы ў адзіноасобным сэктары. Адзіноасобнікі дагэтуль не ачысьцілі ні аднаго кілёграму насеньня і нічога на ссыпалі ў страхавыя фонды. Калгасы таксама тапчэбна правальваюць ачыстку насеньня. 50 проц. калгаснага насеньня яшчэ не ачышчана.

Ул. М—ч.

МАГІЛЕЎ ВЫКЛІКАЕ ВОРШУ

на сацыялістычнае спаборніцтва па лепшай падрыхтоўцы да вясны

МАГІЛЕЎ. (Па тэлефону ад наш. карэсп.). Раённы зьлёт старшынь праўленьняў калгасаў і ўдарнікаў калгаснікаў выклікаў на сацыялістычнае спаборніцтва АРШАНСКІ раён па лепшай падрыхтоўцы і правядзеньні веснавой пасеўнай кампаніі, па лепшай рэалізацыі пастаноў студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б), сэсіі ЦВК СССР і БССР.

Зьлёт даручыў раённаму камітэту партыі і прэзыдыуму райвыканкому выпрацаваць канкрэтны дагавор аб сацыялістычным спаборніцтве паміж Воршай і Магілевам, які падпісаць не пазьней 20 лютага.

Бюро раённага камітэту партыі даручыла ўсім партыйным ячэйкам і сельсаветам разгарнуць масавую работу вакол заключэньня дагавору і ўзмацніць тэмпы ссыпкі насеньня, рамонту сельска-гаспадарчага інвэнтару і правядзеньня агракамічных мерапрыемстваў па ўзьняцьці ўраджайнасьці.

НЭЙДЛІН.

Пад суд раскрадвальнікаў насеньня

ПЯТРЫКОЎ. Ссыпка насенных фондаў у Брынеўскім сельсавеце як па калгасах, так і па адзіноасобным сэктары праходзіць зусім нездавальняюча. Ссыпана: аўса 70 проц., ячменю 69,5 проц., грэчкі 18 проц., ільнасемя 88 проц. і бульбы 86,2 проц.

У некаторых калгасах разбазараваць насенныя фонды. Так, у калгасе **«Новая Глінка»** насенная бульба разбазарана і раскрадзена, пасеўная плошча пад бульбай у калгасе забясьпечана насеньнем толькі на 32 проц. Зладзеі **Малак Франц і Пілер Язэп,** якія сыстэматычна кралі насенную бульбу, **не пакараны.** Старшыня-ж калгасу **Казчык** і ўсё праўленьне калгасу з халадком адносіцца да такіх агідных фактаў. Праўленьне замест прыцягненьня зладзеяў да адказнасьці, упарта ўтойвае факты пакражы.

Трэба зараз жа судзіць зладзеяў калгаснай маемасьці разам з праўленцамі калгасу, якія сталі на шлях іх абароны.

Апрача таго, кулацкія агенты ў некаторых калгасах у замаскаванай форме імкнуцца сарваць і скараціць пасеўныя пляны па тэхкультурах. Асабліва яркі гэта выяўляецца ў калгасах **«Новая Глінка»** і **«Чырвоны Молат».**

Яшчэ горш са ссыпкай насенных і страхавых фондаў па адзіноасобным сэктары. Пляны засеву яравога кліну не даведзены да адзіноасобных гаспадарак.

Ачыстка насеньня як па калгасах, так і адзіноасобным сэктары не разгорнута.

Прарыў у стварэньні насенных і страхавых фондаў па сельсавету зьяўляецца вынікам бязьдзейнасьці партыйнай ячэйкі, сельсавету і пасобных праўленьняў калгасаў. Партыйная ячэйка ня кажучы ўжо аб клярацыйным кіраўніцтве, нават ня ведае што робіцца ў калгасах і як гэтыя калгасы рыхтуюцца да веснавой сяўбы.

РК КП(б)Б павінен зацікавіцца становішчам партыйнай ячэйкі і сельсавету і прыняць адпаведныя захады з тым, каб сельсавет у поўнай падрыхтаванасьці сустрэў сяўбу.

Пінчук В.

ЛЕПЕЛЬСКАЯ МТМ У ПАЛОНЕ У ШКОДНІКАЎ

(АД НАШАГА СПЭЦЫЯЛЬНАГА КАРЭСПАНДЭНТА)

Доўга раскачвалі, выцягвалі буксірам на двор трактар. Ён з вялікай неахвотай запыкаў, загрукаў, ахутаўся дымам і адышоўшы з сотню мэтраў змоўк... Тады бралі другі, а калі і той быў ня лепшы — трэці трактар і хворага зноў цягнулі ў майстэрню.

І так кожны дзень. Толькі разгоніцца — стоп, выпляліся падшыпнікі.

Так было ў мінулым годзе. Калі чалавек едучы з возам зачэпіцца за пень, ён у другі раз або яго абміне, або вывернe, каб не перашкаджаў. Але гэтых элементарных умоў, якія забясьпечваюць магчымасьць прасоўваньня наперад, ня ведаюць і мабыць ня хочуць ведаць кіраўнікі Лепельскай МТМ (машына-трактарная майстэрня).

Ходзяць гэтыя кіраўнікі, ад уласнай нутраной пусталы, ад зацятай бязьдзейнасьці змарнелыя, як манэкены, як застылыя адзні.

Вось перад вамі праходзіць загадчык МТМ **Матусэвіч.** Праходзіць так ціха, павольна, з такім спакойным тварам, нібы яму ўжо нічога не засталося, як толькі падацца ў багадзельню.

Сьцены майстэрні радка бачаць гэтага чалавека. Сьпіць ён надавычай позна, а калі ўстане — калупаецца ў паперах, складае пляны. Сёньня напіша, што майстэрня ў такі-та дзень цавінна адрамантаваць 5 трактараў, заўтра ня знойдзе гэтай паперкі і напіша другую, паводле якой трэба рамантаваць ужо ня пяць, а два-тры трактары.

Паспрабуйце і запытаць у любога рабочага майстэрні аб тым, колькі трактараў патрэбна адрамантаваць — ня скажа, ня ведае. Пляны Матусэвіч піша выключна для сябе, для ўласнага, мабыць, задавальненьня.

А тое, што майстэрня за 2½ месяцы адрамантавала ўсяго 8 трактараў са 105 — напляваць! Нібы такая дробязь можа трывожыць Матусэвіча? Ні ў якім разе!

Вы толькі паслухайце, якімі надавычай багатымі адольнасьцямі ўладае гэты ўжо ня юны па гадох чалавек, гэты сапраўдны паэт і фантазёр (яму-б раманы пісаць аб палёце на луну, а ня трактары рамантаваць).

За два з паловай месяцы адрамантавана 8 трактараў. Так, добра. Гэта значыць на адзін трактар патрачана 9 з лішнім дзён. Застаецца адрамантаваць 97 трактараў. І што-б вы думалі? Матусэвіч складае гатовы плян, паводле якога гэтыя 97 трактараў бярэцца адрамантаваць за 25 дзён—амаль 4 трактары ў дзень. Але праходзіць першы і другі дзень і яны разам не даюць і двух адрамантаваных трактараў.

Стаіць у майстэрні камбінізаваны варштат (фрэзэрны, токарны, шліфавальны, сьвідравальны). Такіх варштатаў у МТМ БССР ёсьць усяго толькі 6. І вось гэты самы дорагакаштоўны варштат стаіць ужо кала трох месяцаў. На ім можна рэзаць і балты, шліфаваць каленчатыя валы, точыць поршневыя кольцы.

— Дык мы-ж шліфуем і точым, дык мы-ж...

За гэтым самым «дык мы-ж» і хаваецца 70 проц. прастою гэтага варштату. Былі дні, тыдні, калі да варштата нават ніхто не дакрануўся. Стаяў ён мярцьвяком, пустым хадзіў пас, дарма круціліся трансмісіі.

Стаяў варштат, хадзілі, як сонныя мухі, рабочыя бяз працы, а Матусэвіч бубніў сабе пад нос: «Няма запасных частак».

Вось яно якое «дык мы-ж».

Дарэмна вы будзеце хадзіць па майстэрні і шукаць людзей, якія рамантавалі той ці іншы матор або трактар. Ня знойдзеце, нібы іх тут і ня было. Нібы рамонт сам робіцца паводле фантастычных пляноў Матусэвіча.

І недарма зараз у адзін голас заяўляюць механік Собалеў, сакратар ячэйкі Казлоў і сам Матусэвіч, што яны ня ручаюцца за якасьць адрамантаваных трактараў. Боязна ручацца. І стаяць трактары не праверанымі. Страшна нават падыйсьці да іх; да гэтых няшчасных трактараў. 28 студзеня падыйшлі былі да аднаго, хацелі апрабаваць, а ў яго адразу-ж выкавяліся падшыпнікі.

Вось яна якая механіка!

Абязьлічан працэс рамонту. За рамонт тэй ці іншай дэталі ніхто не адказвае, ніхто не правярае якасьці. І тому зусім ня дзіва калі некаторыя рабочыя пры зьняцьці махавіка прабуюць на яго ўзьдзейнічаць палкай (не хапае яшчэ, каб жалезам пачалі лупцаваць махавік!), калі каленчаты вал дастаюць з дапамогаю долата ці яшчэ якой-небудзь жалезнай рэчаю, стукаючы па ёй малатком.

— Дык так-жа можна разьбіць падшыпнікі.

— Напляваць, новыя пальлём.

У майстэрні зараз працуе 50 рабочых. Сярод іх толькі 6, якія засталіся з мінулага году.

— Рашта разьбеглася, — разводзіць рукамі Матусэвіч. — Але мы набралі новых, — супакойвае ён, — набралі ня дрэнных рабочых.

Што правільна, то правільна. Набралі. Але каго ўзялі на работу, ніхто ня можа сказаць — ні райком, ні партыйная ячэйка, ні адміністрацыя. Бралі кожнага, хто трапляўся пад руку, бяз усякіх дакумантаў, без азнаямленьня з кваліфікацыяй, з сацыяльным становішчам.

Таму ня дзіва, што нейкія браты **Гарбачовы,** прапрацаваўшы адзін дзень, атрымаўшы па 25 руб. авансу, па 16 клгр. жытняй мукі, пакінулі гасьцінную майстэрню і пайшлі зноў шукаць дурняў, падобных да адміністратараў лепельскай МТМ. Да рэчы, гэтыя Гарбачовы з сабой узялі яшчэ сякія-такія інструманты, якіх і так не хапае ў майстэрні.

І ці трэба ўдакладняць, што ў ноч на 2 лютага яны запалілі сілавы трактар і потым пэўна вылітаваліся над майстэрняй, мабыць пашкадавалі пусьціць з дымам і засыпалі трактар пескам.

Спалілі брэзэнт, высыпалі на трактар цэлую кадушку пяску, а вартаўнік Мялеўскі хадзіў каля майстэрні і нічога ня чуў, ня бачыў.

Дырэктар лепельскай МТС **Бабуноў,** да рэчы, па міласьці якога ў майстэрні сабачы холад і кватэры рабочых ужо месяц не апальваюцца, — рашуча адвёў усякія меркаваньні аб шкодніцтве, праяўленым у засыпцы трактара пескам.

— Якое шкодніцтва? Што вы з глузду зьехалі? Так, маленькая агіднасьць, якую трэба зжыць.

Падпаў майстэрню, пусьці на вецер усё абсталяваньне і Бабуноў сказа: маленькая-няўвязачка, драбнюткая агіднасьць, якую трэба зжыць.

Вось як працуюць у лепельскай МТМ, вось як ахоўваюць сацыялістычную ўласнасьць, рамантуюць трактары.

Малюнак будзе няпоўным, калі мы не пакажам людзей, якія могуць падпальваць трактары, долатам даставаць каленчатыя валы, цэлымі днямі хадзіць па майстэрні без работы, курыць каля бэнзіновых бакаў і наогул у майстэрні (а падлога майстэрні прасякнута бэнзынай, газай, маслам — кінь запалку ці кавалак папяросы і пажар гатовы). Такіх людзей тут больш чым даволі. У студзені было 40 рабочых, сярэдніх 10-25 проц. злосных прагульшчыкаў. Яны, гэтыя людзі, што прышлі сюды, каб толькі атрымаць паёк і прадаць яго на базары (**Голенкаў, Папонскі,** «камсамолец» **Сельвановіч, Мекінчык, Каган** і інш.), прагулялі з 11 студзеня па 1-га лютага ў сярэднім кожны па 10 дзён. З 17 працоўных дзён прагуляць 10 — сапраўды трэба мець асаблівыя адольнасьці.

І нічога, як в гуся вада. Атрымліваюць паёк нароўні з сапраўднымі ўдарнікамі, якія хварэюць душой за кожную дэталь (**Будзкевіч, Місьнік** і інш.), карыстаюцца сталоўкай, атрымліваюць пэнсію.

Ні адзін прагульшчык ня звольнен за прагул. Нібы на майстэрню не пашыраюцца законы савецкага ўраду. Хоць-бы вымову далі якому прагульшчыку. — ні сінь пораху.

Зрэя прагульшчыкаў і разьбільдзяеў, а ня трактарная майстэрня!

Між іншым, ёсьць тут і партыйная і камсамольская ячэйкі. Ёсьць Казлоў—сакратар ячэйкі. «Працую як вол» — кажа ён.

І сапраўды, гэты «вол» мітусіцца, нават штаб створан, але з гэтага ніякага толку, ніякай карысьці.

Посьпех рамонту можа быць забясьпечан толькі пры ўмове тэрміновай ачысткі МТМ ад клясава-варожых элементаў, ад злосных прагульшчыкаў, якія стаяць над патрэбу своячасовасьць рамонту 97 трактараў.

Лепельскія раённыя арганізацыі не аддалі да гэтага часу сур'ёзнай увагі МТМ. Паляпшэньне забясьпячэньня рабочых, разгортваньне масава-выхаваўчай работы залежыць у першую чаргу ад іх. Райком, КК-РСІ павінны прыняць усё залежачае ад іх, каб вывесьці майстэрню з прарыву.

Да гэтага часу ня выклікан да раёну ні адзін трактарыст. Разборка і рамонт трактараў праходзіць бяз удзелу трактарыстаў.

Такое становішча ў значэньні меры адбіваецца на якасьці рамонту. Ня трэба забываць, што ўдзел трактарыста ў рамонце свайго трактара дае яму магчымасьць павысіць сваю кваліфікацыю.

Ул. МЯЖЭВІЧ.

Аб дагаворнай кампаніі паміж МТС і калгасамі

Пастанова ЦК КП(б)Б

ЦК КП(б)Б зварочвае ўвагу ўсіх партыйных, савецкіх, зямельных і калгасных арганізацый на выключнае гаспадарча-палітычнае значэньне дагаворнай кампаніі паміж МТС і калгасамі, якая зьяўляецца адным з рашаючых этапаў падрыхтоўкі да веснавой сяўбы.

ЦК папярэджвае МТС, раённыя і вясковыя арганізацыі, што ўсякі самацёк у гэтай важнейшай гаспадарча-палітычнай справе будзе выкарыстаны кулацкімі і ўсякімі антысавецкімі элемэнтамі для зрыву і адтэрміноўваньня дагаворнай кампаніі, для дыскрэдытацыі новага дагавору і яго прыняцьцю натуральнай аплаты работы МТС.

ЦК прапануе:

1. Наркамзему ў двухдзённы тэрмін надрукаваць (у 30.000 экз.) новы тыповы дагавор і разаслаць на месцы не пазьней 15-II г. г.

2. НКЗ і Трактарным цэнтрам у трохдзённы тэрмін разаслаць МТС і райза дадатковую інструкцыю (аб аплаце дыскаваньня, баранаваньня і г. д., аб аплаце паслуг МТС па вытворча-тэхнічнай кансультацыі і абслугоўваньні калгасаў, аб прыняцьці аплаты работы трактараў на ворыве ў залежнасьці ад профілю мясцовасьці, балот і г. д.).

3. НКЗ і АПТМасу падабраць групу адказных працаўнікоў і камандыраваць не пазьней 16-II—г. г. на аднаму таварышу ў кожную МТС для кіраўніцтва дагаворнай кампаніяй. Райкомам выдзеліць аднаго члена бюро для дапамогі дырэктару МТС на час дагаворнай кампаніі.

Ва ўсёй дагаворнай кампаніі неабходна асаблівую ўвагу зьвярнуць на растлумачэньне прынцыпу натуральнай аплаты работы МТС.

4. Правесьці паміж 17—22 лютага пры кожнай МТС інструкцыйныя нарады старшынь калгасаў і сакратароў ячэек калгасаў, якія абслугоўваюць МТС, з удзелам работнікаў МТС.

5. Правесьці паміж 20—25 лютага ва ўсіх калгасных ячэйках, што абслугоўваюцца МТС, партсьнем з удзелам камсамолу, спэцыяльна прысьвечаны дагаворнай кампаніі.

6. Дасканала падрыхтаваць калгасныя сходы, на якіх будзе абгаворвацца дагавор паміж МТС і калгасам. Лічыць абавязковым папярэднюю апрацоўку дагавору (пры ўдзеле представяніка МТС) на калгасным актыве.

Абавязаць МТС на паказаным калгасным сходзе зрабіць справаздачу аб рабоце на працягу мінулага гаспадарчага году.

7. Улічваючы, што дагавор МТС з калгасам непарыўна зьвязан з паляпшэньнем вытворчага пляну калгасу, ЦК прапануе складаньне гэтых пляноў у калгасах, што абслугоўваюцца МТС, скончыць да 1 сакавіка г. г. Пры складаньні вытворчых пляноў асаблівую ўвагу зьвярнуць на спалучэньне работы трактара і жывой цягі. Адказнасьць за своячасовае складаньне пляноў у гэтых калгасах усклясьці на дырэктароў МТС і загатоўкаў райза. Дагаворную кампанію паміж МТС і калгасамі скончыць да 5-III— г. г.

8. Абавязаць цэнтральны і раённы друк актыўна ўключыцца ў дагаворную кампанію, падрабязна растлумачыць асноўнае палажэньне новага дагавору (натуральная аплата за паслугі МТС, адказнасьць МТС за ўраджай, нарматывы аплаты за розныя віды работ, адказнасьць калгаснікаў за беражлівае адносіны да трактара і г. д.). Мабілізаваць рабселькораў штодзённа выкрываць усякія спробы сарваць або затрымаць дагаворную кампанію.

9. Заслухаць праз дакладу даклад агітмаса ЦК і НКЗБ аб ходзе дагаворнай кампаніі.

ПАВЫШЭНЬНЕМ ТЭМПАЎ ПАДРЫХТОЎКІ ДА СЯЎБЫ АДЗНАЧЫМ УСЕСАЮЗНЫ ЗЬЕЗД КАЛГАСЬНІКАЎ-УДАРНІКАЎ

З прывітаньня УсеЦСПС усесаюзнаму зьезду калгасьнікаў-ударнікаў

МАСКВА, 14. Для арганізацыйна-гаспадарчага і палітычнага ўмацаваньня калгасаў партыя і ўрад стварылі палітаддзелы пры МТС. Прафсаюзы, пад кіраўніцтвам партыі, будуць дапамагаць палітаддзелам разам з вамі змагацца за гаспадарча-палітычнае ўмацаваньне калгасаў. Прафсаюзы шырокім фронтам уключацца ў правядзеньне веснавой сяўбы. Пасьпяховае правядзеньне сяўбы—ёсьць неабходная ўмова паляпшэньня матар'яльнага становішча шмат мільённых мас калгаснікаў і выхаваньня народна-гаспадарчага пляну 1933 г. —першага году другой бальшавіцкай пяцігодкі. Новы ўдзел сацпаборніцтва і ўдарніцтва на заводах і ў калгасах у адказ на пастанову студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) і на прамову тав. Сталіна—павінен забясьпечыць выкананьне баявых задач гэтага году.

Пралетары Савецкага саюзу ўпэўнены ў найлыбейшай адданасьці перадавых калгаснікаў-ударнікаў справе сацыялізму, у іх баявым згуртаваньні вакол партыі і савецкай улады на барацьбу за высокі ўраджай калгасных палёў, за ўмацаваньне вытворчай змычкі з рабочай клясаю, за выкананьне сваіх абавязацельстваў перад пралетарскай дзяржавою.

ПРОБНЫ ВЫЕЗД У ПОЛЕ Ў АДЗНАКУ ЗЬЕЗДУ КАЛГАСЬНІКАЎ-УДАРНІКАЎ

ЛЁЗНА, 15. (Па тэлеграфу). У адзнаку адкрыцьця ўсесаюзнага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў калгасы сумесна з працоўнымі аднаасобнікамі Чарніцкага сельсавету, Лёзьнянскага раёну, 15 лютага арганізавалі пробны выезд у поле. У выезьдзе прымалі ўдзел 195 фурманак з плугамі, боранамі і інвэнтаром. Праверкай адзначана агульная гатоўнасьць да сяўбы калгасаў і працоўных аднаасобнікаў. Асабліва вызначаюцца добрай падрыхтоўкай інвэнтару калгас «Бальшавік», падрыхтоўкай коней—калгас «Іскра».

Калгаснікі і працоўныя аднаасобнікі Чарніцкага сельсавету запэўняюць зьезд і ЦК партыі, што яны ў жорсткай барацьбе з кулацтвам таксама пераможна правядуць веснавую сяўбу першага году другой пяцігодкі, як правялі загатоўкі гэтага году, выканаўшы і перавыканаўшы плян.

ПА ДАРУЧЭНЬНІ МІТЫНГУ—ЛА. СЕЎНЫ ШТАБ.

Група дэлегатаў БССР на зьезд калгасьнікаў-ударнікаў.

Перакрылі праектаваньні ўраду

БАБРУЙСК. (Па тэлефону). Бабруйскі раён па-баявому правёў падрыхтоўку да ўсесаюзнага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў. Уся работа прыходзіла пад лёзунгам 100-проц. падрыхтоўкі да веснавой сяўбы, за высокі ўраджай калгасных палёў.

На раённай нарадзе старшынь калгасаў сумесна з агра-тэхнічнымі сіламі пяць перадавых калгасаў раёну выступілі з рапартам аб перамогах на фронце ўзьдыму ўраджайнасьці. Гэтыя калгасы дабіліся рэкордных для Бабруйскага раёну паказальнікаў на ўраджайнасьці, перакрыўшай ужо ў гэтым годзе праектаваньні ўраду на 1933 год.

Калгас імя Літвінава зьняў з аднаго га 11 цэнтн. жыта, 13 цэнтн. ячменю, 12 цэнтн. пшаніцы, 130 цэнтн. бульбы, калгас «Новы шлях» — 12 цэнтн. збожжавых, 130 цэнтн. бульбы; калгас імя Дзяржынскага — 12 цэнтн збожжавых, 121 цэнтн. бульбы. Прыблізна такія-ж паказальнікі ўраджайнасьці маюць калгасы імя Варашылава і «Чырвоная Бярэзіна».

Раён у аспоўным скончыў ссыпку насенных фондаў. Па збожжавых ссыпана 101,1 проц., травах — на 103 проц., бульбе — 106 проц., тэхнічных — 96 проц.

Усе сілы перакінуты на неадкладнае завяршэньне ачысткі насеньня, пратручваньне яго, рамонт інвэнтару, падрыхтоўку цягавай сілы.

Чыкун.

АБ КАРМОХ

З пастановы Цэнтрпасеўкому ЦК КП(б)Б ад 13-II-33 г.

1. Заслухаўшы паведамленьне нам. Упаўпаркамсаўгасаў тав. Сьмірнова і дырэктароў трэстаў т. т. Сьцяпанава (Менск, Малпрамтрэст), Жука (Менск, Сьвінтрэст), Абрамчыка (Гомельск. трэст), Дэрмна (Магілеўскі трэст) і Сідаровіча (Птушкатрэст), пасеўкамісія адзначае, што атрыманьне вызначаных саюзнымі органамі кармоў пастаўлена выключна дрэнна. З боку кіруючых работнікаў Наркамзему, а таксама адпаведных трэстаў адсутнічае сыстэматычны нагляд за гэтай справай, а таксама веданьне сапраўднага становішча з атрыманьнем кармоў, іх адгрузкі і г. д.

2. Даручыць пэрсаналына тав. Турлаю правесьці на працягу двух дзён разгляд па лініі ЦКК пастаноўкі гэтай справы па адпаведных трэстах, і вінаватых у выключна дрэнным становішчы гэтай справы прыцягнуць да партыйнай адказнасьці, як першай папярэджваючай меры пакараньня.

3. Папярэдзіць т. т. Сьмірнова і дырэктароў трэстаў: Абрамчыка (Гомалпрамтрэст), Сьцяпанава (менскі Малпрамтрэст), Казака (віцебскі Малпрамтрэст), Жука (менскі Сьвінаводтрэст), Стрыго (магілеўскі Сьвінаводтрэст), Аскерка (аршанскі Сьвінаводтрэст), Сідаровіча (Птушкатрэсаводтрэст, Менск), Рудзько (Племсьвінатрэст), Букцерава (Племмалпрамтрэст, Горкі), што ў выпадку невыкананьня работ па атрыманьні, разьмеркаваньні і разгрузцы гэтых кармоў, неўстанаўленьня стражэйшай эканоміі ў іх выдаткаваньні, — яны будуць прыцягнуты да судовай адказнасьці, як за парушэньне дырэктыў партыі і ўраду.

4. Устанавіць штодзённую справаздачнасьць аб ходзе атрыманьня і разгрузкі кармоў, пунктах і тэрмінах адгрузкі, якую прадстаўляюць пасеўкамісіі.

5. Лічыць неабходным вызначыць адказных прадстаўнікоў для пасылкі на Украіну і ЦЧВ для паскараньня справы атрыманьня кармоў, а таксама нагляду і кантролю за работай упаўнаважаных па гэтых абласьцях, дасланых ужо раней.

6. Папярэдзіць дырэктароў саўгасаў, якія атрымліваюць кармы, што з іх боку павінны быць неадкладна прыняты меры да атрыманьня і адгрузкі вызначаных ім кармоў.

РК КП(б)Б устанавіць кантроль за правядзеньнем гэтай работы.

7. Даручыць тав. Рэзьнікаву ўстанавіць нагляд за прасоўваньнем і разгрузкай па л

ПАВЫШЭНЬНЕ ЎРАДЖАЙНАСЬЦІ-ЦЭНТРАЛЬНАЯ ЗАДАЧА

З выступленьня т. К. БЭНЭКА на IV сэсіі ЦВК БССР

Арганізацыйна-гаспадарчае умацаваньне калгасаў зьяўляецца асноўнай задачай у разьвіцьці сацыялістычнай сельскай гаспадаркі на даным этапе. Тав. Сталін у сваім дакладзе на апошнім пленуме ЦК і ЦКК УсеКП(б) «Аб выніках першай пяцігодкі» і ў сваім выступленьні «Аб рабоце ў вёсцы» указаў, чаму гэта задача зьяўляецца раналочай на даным этапе.

Асноўным зьвяном у арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў зьяўляецца павышэньне прадукцыйнасьці працы, а значыць—павышэньне ўраджайнасьці. Такім чынам усе планы мерапрыемстваў павінны спрыяць ажыцьцяўленьню гэтай задачы. Партыя і ўрад указалі, што: «наступіў час, калі ад росту гаспадаркі ў шырыню шляхам павялічэньня пасўных плошчаў, трэба пераарыцца да барацьбы за лепшую арганізацыю зямлі, да барацьбы за павышэньне ўраджайнасьці, як галоўнай і цэнтральнай задачы ў галіне сельскай гаспадаркі на данай стадыі разьвіцьця».

Гэту важнейшую задачу павінны ведаць ня толькі кіраўнікі нашых земельных органаў, ня толькі адказныя работнікі, якія працуюць у цэнтры, на месцах і ў сельсаветах, але ўсе калгасныкі, усе працоўныя аднаасобнікі. На жаль, мы гэтага яшчэ ня маем. Да апошняга часу на ўсе лічэ мабілізаваліся на выкананьне гэтай асноўнай і цэнтральнай задачы, якая пастаўлена перад намі ЦК УсеКП(б), СНК Саюзу і апошнім пленумам ЦК КП(б)Б. У гэтым вінаваты мы ўсе і работнікі цэнтральных арганізацый, і работнікі раёнаў і сельсаветаў.

Што мы маем на сёньняшні дзень? Сярэдні процант ссыпкі насеньня ў БССР на 9 лютага 1933 г. па збожжавых культурах складае 91,9, па ільну—71,9, па каноплях—83,8 і па бульбе—92,2, г. зн. планы ссыпкі насеньнафонду ня выкананы. Між тым, трэба напомніць усім, што тэрмін ссыпкі насеньня ўжо прайшоў.

Па асобных раёнах (я ня буду называць усіх, а толькі некаторыя), мы маем яшчэ горшае становішча. Так, па збожжы ссыпалі насеньфонды: Крупскі раён—90,3 проц. плану, Горацкі—76 проц., Оршанскі—70 проц., Пранойскі—78 проц. і г. д. Па ільну: Асьвейскі раён ссыпаў 30,1 проц., Полацкі—21 проц., Расонскі—19 проц. і г. д. Тое-ж самае мы маем і па бульбе. Процант выкананьня плану ссыпкі збожжа і бульбы па гэтых раёнах сунадае і гэта сьведчыць, што ўказаньня ўрада дрэнна выконваюць гэту важнейшую задачу.

Што значыць своячасовая ссыпка насеньня для ўзьнімцьця ўраджайнасьці? Гэта значыць, што мы можам своячасова прыступіць да сяўбы, забясьпечыць ўсе насеньне ад разбазариваньня. Своячасовая ссыпка насеньня дае нам магчымасьць праверыць якасьць насеньня, ачысьціць яго, праверыць яго ўсхожасьць. І нарэшце мы ня выканалі гэтай важнейшай задачы—ссыпкі насеньных фондаў па БССР—а па цэлым разе раёнаў мы маем у гэтай галіне зусім дрэнае становішча, то ясна, што мы зараз ужо ставім пад пагрозу пасьпяховае выкананьне задач веснавой пасеўнай кампаніі. І ўсе разважаньні—гэта слясная дэкларацыйная лабуда, усе рэзалюцыі аб падтрыманьні генэральнай лініі партыі нічога ня варты, калі няма работы.

Сапраўды бальшавіцкая справа зараз залежыць у тым, каб у кожным калгасе, у кожнай вёсцы насеньныя фонды былі ссыпаны, ачышчаны, была праверана якасьць гэтых фондаў, адрэмонтаваны машыны, трактары, каб добра заготавіліся коні. Вось выкананьне гэтых задач і будзе называцца бальшавіцкай падрыхтоўкай да веснавой сяўбы 1933 г., першай бальшавіцкай вясны пяцігодкі.

Выступленьні тут на сэсіі, зразумелы, у асноўным правільныя. Усе імкнуцца як мага лепш падрыхтавацца да пасеўнай кампаніі. Але ўсё-ж многія заварушны ня б'юць у той пункт, у які трэба біць. Вось шмат разважаньняў пасьвяшчаецца пытаньню, што, моў, насеньня няма і г. д. Насеньне ёсьць, і яго трэба толькі сабраць. Кулацкім элементам разважаньням трэба даць рашучы адпор.

Мы, таварышы, у галіне ссыпкі насеньня тэхнічных культур маем выключна дрэнае становішча. Не таму, што гэтага насеньня няма. Насеньне ёсьць. Справа ў тым, што цэлы рад калгасаў і частка працоўных аднаасобнікаў адносяцца да ільну як да казённай культуры. З гэтымі кулацкімі разважаньнямі і настроямі да ільну і канапель трэба ўсім нам, усім членам ЦВК, павесьці рашучую бальшавіцкую барацьбу.

Што значыць ня сеяць ільну? Гэта значыць не даваць сацыялістычнай прамысловасьці сырцу для вырабу тканін і забясьпячэньня імі працоўнага насельніцтва БССР і усяго Савецкага Саюзу. Калі-б які-небудзь кулак прыйшоў у калгас ці да працоўнага аднаасобніка і сказаў: ня сей жыта ці пшаніцы—вось-вось пачнуцца. А калі ён гаворыць: ня сей ільну,—дык ён знаходзіць некаторую апраўдальнасьць для сваёй агітацыі. Я хачу на гэтым спыніцца з тым, каб сёлета сяўбе тэхнічных культур аддавалі выключную увагу.

Што мы мелі ў мінулым годзе? Тэхнічных культуры, як правіла, селі на горшай зямлі. За тэхнічнымі культурамі ня было належнага догляду. Рад-ка раёнаў (Чашусы, Лёзна і г. д.) паказаў, што ўмее змагацца за лён, але шмат раёнаў дрэнна пасеялі, дрэнна даглядзелі ўраджай, дрэнна ўбралі, дрэнна слалі і дрэнна мачылі лён. Потым тое, што выраслі, сабралі, разаслалі і нават падмалі са сьцелішча, ня ўсё закалалі, ня ўсё высушылі і не давялі гэтай справы да канца. Затое кулак у цэлым разе калгасаў, раёнаў і сельсаветаў пра вёў сваю контрэвалюцыйную работу па псаваньні ўраджаю ільну да канца. А ў гэтых раёнах сядзелі асобныя члены ЦВК, сядзелі старшыні сельсаветаў, работнікі РВК, МТС і яны, спрацёўшы клясавую пільнасьць, ня ўбачылі таго, як кулак робіць сваю работу, як кулак працуе супроць нас, як кулак імкнецца сарваць правядзеньне нашых задач, нашай работы. І вось такая «работа» на сяўбе, уборцы і апрацоўцы ільну ў разе калгасаў, працоўных аднаасобных гаспадарак прывяла да значнага зьмяншэньня рэнтабэльнасьці сяўбы ільну. А гэта скарыстоўвае кулак для сваёй агітацыі. Павышэньне-ж рэнтабэльнасьці сяўбы ільну залежыць у значнай меры ад таго, як правядзем сяўбу. І таму пры падрыхтоўцы да пасеўнай кампаніі гэтага году мы павінны ўлічыць урокі леташняй сяўбы, уборкі і апошняй загатоўчай кампаніі.

Сэсія ЦВК павінна патрабаваць, каб усе нашы планы ссыпкі насеньфондаў, вычысткі іх, рэмонту машын былі выкананы на працягу бліжэйшых дзён, бо чым больш гота работа будзе адцягвацца, тым больш будзе перашкаджаць пасьпяховаму правядзеньню пасеўнай кампаніі.

Тыя тэмпы, якія адкладаюць са складаньнем выкананьня плану загатоўкі ільну, павінны на працягу бліжэйшых дзён поўнасьцю скончыць іх. Гэтымі мы вызвалім, і кадры і апрымаем магчымасьць усю ўвагу, усю сілу, усю энэргію накіраваць на лепшую падрыхтоўку да пасеўнай кампаніі.

Што патрэбна, каб забясьпечыць добры ўраджай нашых калгасных і саўгасных палёў? Мы, таварышы, маем сёлета выключна спрыяючыя ўмовы для гэтага. У БССР калгасны сэктар займае 55 проц. усёй пасеўнай плошчы БССР, у калгасах і саўгасах значна павялічылася колькасьць машын, трактараў і інш. інвентару, што дае магчымасьць узьвысіць прадукцыйнасьць працы, у кароткі тэрмін скончыць сяўбу.

Машыны ў калгасах і саўгасах мы скарыстоўваем да гэтага часу недашупчельна. У цэлым разе раёнаў кіраўнікі МТС, сельсаветаў, саўгасаў і калгасаў адносяцца да машын па-барбарску. Цяжка знайсьці словы, каб выказаць тое абурэньне, якое выклікаюць адносіны да машын у разе калгасаў. Нярэдка-ж так цяжка машыну, якая скончыла сваё вытворчыя функцыі на полі, убраць куды-небудзь пад навес? Навесаў-жа ў нас у вёсцы колькі хочаце. Дык не: навесь стаіць пустой, а за не калькі кросаў ад яе машына пад сьнегам, пад дажджом псуецца і ламаецца. Нярэдка-ж мы ня можам гэтай машыны ўбраць? Гэта-ж машына не капіталіста, які скарыстоўвае яе для ўзмацненьня эксплёатацыі рабочых, а гэта наша машына, якая павінна й можа палегчыць працу калгасьнікаў. Мы павінны ахоўваць яе як мага лепш для апрацоўкі нашай глебы, для пасеву, для ўборкі.

І вось наша задача—укараніць у сьвядомасьць кожнага калгасьніка, кожнага аднаасобніка, кожнага рабочага МТС і саўгасу тое, каб ён даражыў савецкім дабром, рабоча-сялянскім дабром. І за гэта трэба змагацца.

Побач з гэтым мы маем такія выпадкі, калі калгасьнікі, рабочыя саўгасаў і МТС звяртаюць увагу адміністрацыі, кіраўніцтва на недахопы, часам проста злачынствы, але ня рэдка чуюць бюракратычныя адказы: «гэта не твая справа, я ведаю, што раблю». Гэтыя, як сказана ў выступленьні т. Постышава на сходзе Харкаўскага актыву, вяльможна-панскія адносіны да ўказаньняў і крытыкі працоўных павінны быць строга асуджаны. З такімі адносінамі трэба змагацца.

Мы маем выпадкі, калі да гэтага часу машыны яшчэ знаходзяцца на полі. Няўжо-ж гэта не злачынства? А між тым бывае, што вышчэўленыя злачынствы ў гэтай галіне на працягу некалькіх дэкад марынуюцца, і вінаватыя не перадаюцца суду. Такія злачынствы—кулацкая работа і накіраваны яны на развал нашых сацыялістычных прадпрыемстваў, на вёсцы. Гэтаму трэба пакласьці канец. Добрае хаваньне машыны, трактара і іншага інвентару ў нашай сельскай гаспадарцы зьяўляецца вялізарнейшым фактарам пасьпяховага выкананьня пасеўнай кампаніі і ўзьнімцьця ўраджайнасьці.

Трэба ва што-б там ні стала дабіцца своячасовай сяўбы. Што мы маем у гэтай галіне? Старыя разважаньні некаторых калгасьнікаў і аднаасобнікаў аб тым, што лён можна пасеяць толькі тады, калі пасеюць усе збожжавыя культуры, а авёс трэба сеяць пасьля шасьці тыдняў па вялікадні, незалежна ад таго, калі гэты вялікдзень бывае—у сакавіку ці ў красавіку. Вядома, гэта старыя, нісуцьшныя мэтады і з імі трэба змагацца. Трэба супроць гэтага мабілізаваць перадавую частку калгасьнікаў. Між іншым, на адным са сходаў у Коханавіцкім сельсавеце, Асьвейскага раёну, выступіў калгасьнік і завёў пугарку аб тым, чаму рана ільну сеяць нельга. Ён гаворыць: «я ня супроць ільну, рана сеяць лён добра, добры лён вырасьце, але ўбраць яго рана немагчыма таму, што ўсё разам пасьпявае». Калі ад раньняй сяўбы ільну лепшы ўраджай будзе, значыць трэба сеяць рана, але летам трэба разьвяртоўваць рабочую сілу аднаведным чынам. Трэба пры цягнуць да працы больш жанчын. Пра вільна тут выступіла адна дэлегатка і таварыша, што жаночая праца не скарыстоўваецца таму, што ня створаны неабходныя бытавыя ўмовы, як ясьлі для дзяцей. Мы з году ў год разгортваем ясельную справу, тэты выдатак адпраўляецца і аплачваецца ўдубальт удзелам жанчын на палявых работах, а між тым многія таварышы гэтага не разумеюць і падыходзяць да справы па-цяляцку.

Трэба дабіцца таго, каб правесьці своячасова сяўбу ільну, каб мабілізаваць на гэта ўсю рабочую сілу, якая ёсьць у калгасе. Нельга паўтараць памылкі мінулага году, калі ў сярэдзіне чэрвеня сяўба яшчэ ня была скончана. Гэтага мы сёлета не павінны дапусьціць. Сяўбу мы можам выканаць у тэрміны, устаноўленыя партыяй і ўрадам. Легась былі такія пугаркі: у адным раёне—сёньня дождж, ня можам сеяць, а ў другім—сёньня ня было дажджу, нельга сеяць, бо суха. Няправільна гэта. Трэба скарыстоўваць любы час для своячасовага выкананьня плану сяўбы.

Для узьнімцьця ўраджайнасьці патрэб на таксама і добраякасная апрацоўка глебы. Вось сядзяць тут усе, якія былі на пасеўнай кампаніі, ведаюць, як у многіх месцах апрацоўваецца глеба. Напрыклад, па тым-жа ільну што мы маем? Уцяўляецца цаліна толькі вясной, зямлю ставяць дыбам і потым сеюць лён. Лён то вырастае кучкамі лідронна, па росту доўгі, але многа насеньня гніе пры такой апрацоўцы зямлі і гэта прыводзіць да таго, што і калгас, і дзяржава не даатрымліваюць вялікай колькасьці прадукцыі.

Таму трэба дабіцца добраякаснай апрацоўкі глебы. Гэта фундамант для ўраджаю. Калі зямля дрэнна апрацавана, то нават калі паложыш на яе гной, гэта ня дасьць тых вынікаў, які дасьць гэты-ж гной пры добрай апрацоўцы глебы. Зразумела, гной трэба своячасова вывозіць, трэба класьці і іншыя мінэральныя ўгнаеньні, але нельга апрацоўваць глебу так, каб кідаць насеньне ў груды. Зямлю трэба апрацоўваць так, каб можна было выкарыстаць ільнасерабілку. Кулакі і іх падпявалы та вораць, што ільнасерабілка пры нашых умовах не падыходзіць таму, што нярэўная глеба. А чаму нярэўная глеба? Таму, што мы самі не дрэнна апрацоўваем. Глупства, выправільна гэта і такім кулацкім разважаньням трэба даць рашучы адпор.

Нахонт севазвароту. Тут яшчэ, што павінны дапамагчы Наркамзэмляробства і ўсе нматэтыкі інстытуты і навуковыя установы, якія ён мае ў сваёй сыстэме. Трэба паслаць людзей, каб даць дакладныя ўказаньні нахонт севазвароту кожнаму калгасу, каб ня было тых гутарак, што лён прыходзіцца сеяць 4 гады засаб. Справу севазвароту мы павінны ў гэтым годзе пачаць і праводзіць энэргічна з тым, каб устанавіць, нарэшце, правільны севазварот. Тут патрэбна давоўі напружаная праца ўсіх органаў Наркамзэмляробства.

Заканчэньне кампаніі зьяўляецца адной з важнейшых задач для пасьпяховай сяўбы. Пленум ЦК УсеКП(б) і СНК СССР вынесьлі асобную пастанову аб умацаваньні нашага коннага парку, каб вывесьці на поле з добрымі конямі. Кулацкія элементы і іх агенты ў калгасах прабуюць праз зьнішчэньне каня разваліць калгас. Прычым гэтыя кулакі выступаюць пад «словымі» фразамі, што, моў, пры нашаўсьці трактараў і сельска-гаспадарчых машын коні нам непатрэбны. Ужо ня кажучы аб абарончым значэньні каня, апошні захоўвае выключную вагу ў сельскай гаспадарцы. Захаваць каня, зьнішчыць абязьлічку ў яго абслугоўваньні, спыніць драпежную эксплёатацыю каня—важнейшая задача, якая, зразумела, ня можа быць ажыцьцёўлена без вырыць ці і зьнішчэньня кулацкіх мазэўраў.

Адным з важнейшых мерапрыемстваў, якое павінна значна спрыяць узьнімцьню ўраджайнасьці, зьяўляецца новы закон аб збожжазагатоўках 1933 г. Аб гэтым законе павінен ведаць кожны калгасьнік, кожны аднаасобнік, бо нормы, устаноўленыя на кожным раёне пастановай ЦК і Саўнаркому БССР зьяўляюцца абавязковымі. Гэта значыць, што мы гарантуем калгасьніку, аднаасобніку, што той плян, які ён атрымлівае па адным збожжа, ніхто ня можа на працягу ўсяго году зьмяніць. Заданьне дасьцца ў сакавіку і гэтым дасьцца магчымасьць калгасу, аднаасобніку скарыстоўваць усе свае рэсурсы для ўзьнімцьця ўраджайнасьці. Ніхто ня мае права зьмяняць гэтых норм. У законе так і сказана: «Бэзумоўна забараняецца мясцовым органам улады і загатоўчым органам дапускаць суступчывыя планы або накладваць на калгасы і аднаасобныя гаспадаркі абавязкі па выдачы збожжа, якія перавышаюць пастаянныя нормы, устаноўленыя гэтым законам. Усе лішкі збожжа пасьля выкананьня абавязкаў перад дзяржавай, застаюцца ў поўным распараджэньні саміх калгасаў, калгасьнікаў і аднаасобнікаў». Аб гэтым павінны ведаць усе калгасьнікі, усе працоўныя аднаасобнікі, бо гэта зьяўляецца выключна важным момантам, які стымулюе напружэньне пасеўных плошчаў і палепшэньня сяўбы. Усе бросавыя землі, усякія нэўдобныя землі, якія будуць асвоены пасьля перадачы абавязацельства аб здачы дзяржаве збожжа ў плян ня будуць уключацца.

Некаторыя кажуць так: у залежнасьці ад ураджаю трэба даваць заданьне аб здачы збожжа. Ня трэба прыкрываць усіх узьнімаць ураджайнасьць. Калі мы пагрэбуем зьмяняць пастаўчаныя нормы таму, што там лепшы, а там горшы ўраджай, гэтым мы падарвем зацікаўленасьць у далейшым узьнімцьці ўраджайнасьці. Трэба загадзя паказаць калгасу, працоўнаму аднаасобніку, што яны павінны будуць здаваць дзяржаве, каб яны разьвярнуўвалі свае сілы, свае сродкі так, каб атрымаць як можна больш ўраджай.

Разам з гэтым трэба растлумачыць кожнаму калгасьніку, аднаасобніку закон, што па калгасах, якія ня выканалі сваіх абавязкаў па здачы збожжа дзяржаве ва ўстаноўленыя каляндарныя тэрміны, накладваецца грашовы штраф у памеры рынкавага кошту непаставанай часткі і, апрача гэтага, гэтыя калгасы павінны будуць у бясспрэчным парадку здаваць дапарыкова ўсё збожжа па гадавому плану. Аднаасобныя-ж гаспадаркі, якія ня выканалі сваіх абавязкаў па здачы збожжа дзяржаве ва ўстаноўлены тэрмін, прыцягваюцца да судовай адказнасьці.

Рад калгасаў паказалі, што пры добрай працы яны маюць магчымасьць заблыснець сабе вялікай колькасьцю збожжа. Аб гэтым тут гаварылі таварышы і гэтым мы павінны ганарыцца. Пра такія калгасы павінны ведаць усе. Як яны дабіліся такіх посьпехаў? Яны правільна арганізавалі працу, правільна змаглісь за арганізацыйна-гаспадарчае умацаваньне калгасаў, выкрывалі кулацкія махінацыі, правільна расставілі сілы, цільна сачылі за інвентаром, жывёлай і г. д. Усё спаўрае праца і там, дзе гэта праца была арганізавана як сьлед, яна дала добрыя вынікі. Па гэтых лепшых калгасах трэба раўняцца.

Апошняя заўвага. Пасеўную кампанію, вядома, ня можа правесьці толькі Наркамзэмляробства і яго органы. Пасеўная кампанія—справа ўсіх раённых і ўсіх цэнтральных арганізацый. Ніхто ня мае права стаяць у баку. Пасьпяховае правядзеньне пасеўнай кампаніі за бясспрэчнае добрае правядзеньне загатовак, дае магчымасьць разгарнуць усе асталёны галіны народнай гаспадаркі. Ад пасьпяховага правядзеньня пасеўнай кампаніі залежыць у значнай меры разгортваньне нашай лёгкай, харчовай, сакатуўнай прамысловасьці, выраб прадметаў шырокага ўжытку і далейшае палепшэньне забесьпячэньня ўсіх працоўных мас.

Таму трэба, каб ня толькі Наркамзэм ляробства (ён, зразумела, у першую чаргу), але і ўсе арганізацыі, займаліся гэтай справай. Мы ведаем, што шмат недахопаў было і ёсьць у Наркамземе, мы ведаем, што Наркамзем і яго органы дрэнна працавалі і працуюць, што там да гэтага часу канчаткова не выкарталі «прыпітэнаўшчына». Мы павінны яго за гэта крытыкаваць, але таксама і дапамагчы. Усіх наркаматаў, усіх раённых арганізацый датычыць веснавая пасеўная кампанія.

Вазьмеце Наркамаховы здароўя. Хіба-ж ня ён у першую чаргу павінен дапамагчы раёнам у гэтай справе. Возьмем Наркамасьветы, Наркампажрам і г. д.—усе яны могуць і павінны дапамагчы раёнам у правядзеньні пасеўнай кампаніі.

Тут на сэсіі т. Турлай гаварыў аб абурэньнях выпадкам бюракратызму ў нашых установах у справе падрыхтоўкі да сяўбы. Трэба рашуча зьнішчыць усякія бюракратычныя перагародкі. Усе работнікі павінны накіраваць сваю увагу на пасьпяховую падрыхтоўку і правядзеньне сяўбы.

Калі мы ўсе возьмемся за справу, зразумеем важнасьць правядзеньня пасеўнай кампаніі, калі кожны з нас уявіць сабе вялікае значэньне пастановы ЦК—тады бальшавіцкія тэмпы сяўбы мы забясьпечым.

Веснавая пасеўная кампанія, як загатоўкі гэтага году, будзе праходзіць ва ўмовах жорсткай клясавай барацьбы. Кулацтва, якое разгромлена, але канчаткова не дабіта, яго агенты ў асобных зьвенньнях савецкага апарату і пар тыі прабуюць на асобных участках сарваць сяўбу. Клясавая пільнасьць павінна быць узмоцнена. Кожны член ЦВК, член РВК, рабочы, кожны калгасьнік павінны выкрываць кулацкія мажэўры. Усякая кулацкая і апарэтуністычная спроба як у калгасе, сельсавеце, раёне, так і ў цэнтральнай установе сарваць сяўбу павінна атрымаць рашучы адпор.

Пад бальшавіцкім кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б), на чале з правадыром нашай партыі і міжнароднага пралетарыяту—тав. Сталіным, мы, бязумоўна, выканаем заданьне па веснавой сяўбе поўнасьцю і ў тэрмін. (Воплескі).

Аб рэарганізацыі Камітэту па загатоўках сельгаспрадуктаў

Пастанова Савету Народных Камісараў Саюзу ССР

Савет Народных Камісараў Саюзу ССР пастанаўляе:

1.—Ператварыць Камітэт па загатоўках с.-г. прадуктаў пры СНА ў Камітэт па загатоўках с.-г. прадуктаў пры СНК СССР.

Камітэт па загатоўках с.-г. прадуктаў пры Саўнаркоме СССР дзейнічае па паўнамоцтве апошняга і яго пастановы па пытаньнях загатовак с.-г. прадуктаў маюць сілу пастаноў СНА.

2. — Усклясьці на Камітэт па загатоўках с.-г. прадуктаў пры Саўнаркоме СССР кіраўніцтва ўсёй работай па правядзеньні ў жыцьцё пастановы СНК СССР і ЦК УсеКП(б) ад 19 студзеня 1933 г.: «Аб абавязковай пастаўцы збожжа дзяржаве калгасамі і аднаасобнымі гаспадаркамі» (З. З., 1933 г., № 4, арт. 25).

3. — Сваю работу на мясцох па правядзеньні ў жыцьцё закону «Аб абавязковай пастаўцы збожжа дзяржаве калгасамі і аднаасобнымі гаспадаркамі» Камітэт па загатоўках с.-г. прадуктаў пры Саўнаркоме СССР праводзіць праз сваіх упаўнаважаных у рэспубліках, краёх і абласьцях, а ў раёнах — праз спэцыяльна прызначаных раённых упаўнаважаных.

4. — Упаўнаважаныя ў рэспубліках, краёх, абласьцях і раёнах падначалены толькі Камітэту па загатоўках с.-г. прадуктаў пры Саўнаркоме СССР.

5. — Распараджэньні Камітэту па загатоўках с.-г. прадуктаў пры Саўнаркоме СССР па пытаньні правядзеньня ў жыцьцё закону «Аб абавязковай пастаўцы збожжа дзяржаве калгасамі і аднаасобнымі гаспадаркамі» абавязковы да выкананьня для ўсіх органаў улады на мясцох і могуць быць скасаваны толькі Саўнаркомам СССР.

6. — Устанавіць, што райупаўнаважаныя Камітэту па загатоўках с.-г. прадуктаў пры Саўнаркоме СССР па правядзеньні ў жыцьцё закону «Аб абавязковай пастаўцы збожжа дзяржаве калгасамі і аднаасобнымі гаспадаркамі» прызначаюцца і зьнімаюцца пастановамі Камітэту па загатоўках с.-г. прадуктаў пры Саўнаркоме СССР па прадстаўленьні яго ўпаўнаважаных у рэспубліках, краёх і абласьцях.

7. — Усклясьці на райупаўнаважаных Камітэту па загатоўках с.-г. прадуктаў пры Саўнаркоме СССР складаньне сьпісу калгасаў і аднаасобных гаспадарак, якія прыцягваюцца да абавязковай пастаўкі збожжа дзяржаве, складаньне і перадачу кожнаму калгасу і кожнай аднаасобнай гаспадарцы абавязацельстваў па здачы збожжа; улік і нагляд за выкананьнем гэтых абавязацельстваў па колькасьці, культурах і тэрмінах, прыняцьце як непасрэдна, так і праз мясцовыя органы ўлады ўсіх неабходных мер, што забясьпечваюць бязумоўнае выкананьне абавязацельстваў па пастаўцы збожжа кожным калгасам і кожнай аднаасобнай гаспадаркай раёну па культурах і тэрмінах пастаўкі.

8. — Усклясьці на Камітэт па загатоўках с.-г. прадуктаў пры Саўнаркоме СССР і яго ўпаўнаважаных на мясцох кіраўніцтва зборам гарнца, прыёмку збожжа ад саўгасаў у адпаведнасьці з устаноўленым для іх урадам планам збожжазадачы, а таксама прыёмку ўсяго збожжа ў МТС, атрыманага ад калгасаў у аплату за работу.

9. — Устанавіць наступныя штаты райупаўнаважаных па правядзеньні ў жыцьцё закону аб абавязковай пастаўцы збожжа дзяржаве калгасамі і аднаасобнымі гаспадаркамі ў залежнасьці ад аб'ёму работ у тым ці іншым раёне: райупаўнаважаны, 1—2 памочнікі, 1—2 вучотчыкі.

Тэхнічнае абслугоўваньне апарату райупаўнаважанага ўсклясьці на райвыканкомы.

Старшыня Савету Народных Камісараў Саюзу ССР
В. МОЛАТАЎ (СКРАБІН).
Нам. кіраўніка справамі Савету Народных Камісараў Саюзу ССР
І. МІРОШНІКАЎ.

Масква, Крэмль,
13-га лютага 1933 г.

Няма яшчэ рашучага зруху ў разгортваньні дзяржаўнай закупкі збожжа

Узмацніць барацьбу з перакупшчыкамі і спэкулянтамі

Ні аднаго кілёграма спэкулянту

СЛУЦАК. Для закупкі збожжа ў раёне арганізавана 5 закупачных пунктаў: два ў Слуцку, адзін ва ўрэччы, у Новадворцах і Сьцелішчах. Пры пунктах адкрыты крамы, у якіх ёсьць рад дэфіцытных тавараў: абутак, цьвікі, ваконнае шкло, шэрсьць; мануфактура, шынное жалеза, вопратка, эмаляванае начыньне і інш.

Перадавыя калгасы—«Прамень ка муны», «Бальшавік» ужо разгарнулі продаж збожжа дзяржаве.

Клясавы вораг імкнецца ўсімі спосабамі сарваць дзяржаўныя закупкі. Ён агітуе, што «зараз праводзяцца другія загатоўкі, што савецкая ўлада забярэ ў калгасьнікаў усё збожжа». Таму галавая задача ўсіх мясцовых арганізацый — растлумачыць сялянству, якія выгады яно атрымлівае ад продажу збожжа дзяржаве, даказаць, што закупка збожжа зьяўляцца адным з асноўных шляхоў разгортваньня калгаснага гандлю.

***

СТАРОБІН. Паводле пастановы вышэйшых арганізацый, плян закупак збожжа дзяржавай па раёне ўстаноўлен у разьмеры 4.316 цэнтнэраў. Закупкі даручаны райспажыўсаюзу, які адкрыў закупачны пункт у м. Старобін.

Першымі арганізавалі чырвоны абоз з лішкамі збожжа для продажу дзяржаве калгасьнікі Чьжэвіцкага сельсавету. Калгас «Свабода» прадаў 500 кілёграм збожжа, калгасьнікі 388.

Калгас «Перамога» прадаў 400 клг., калгасьнікі—163.

Кампанія разгортваецца пад лёзунгам: «НІ АДНАГО КІЛЁГРАМА ЗБОЖЖА СПЭКУЛЯНТУ І ПЕРАКУПШЧЫКУ.

Пункты--на замку...

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Раён выканаў цэнтралізаваны плян збожжазагатовак на 105 процантаў. Шмат збожжа яшчэ застаецца ў вёсцы. Таму, задача партыйных, савецкіх і кааперацыйных арганізацый накіраваць гэтыя лішкі па рэчышчу калгаснага гандлю на патрэбы дзяржавы. Для раёну ўстаноўлен плян закупак збожжа дзяржаве ў **700 тон.** Лічба гэта невялікая, яна складае толькі 29 проц. плану цэнтралізаваных загатовак.

Але гэтыя 700 тон не загатовіш са мацёкам. Закупкі збожжа трэба арганізаваць, дабіцца таго, каб не адзін кілёграм ня трапіў у рукі спэкулянта.

Як у Бабруйску арганізавалі закупку?

Калі запытацца ў РК, РВК, Райспажыўсаюзе, Загатзбожжы, як арганізаваны закупкі, дык ніякага выразнага адказу не атрымаеш. Райком і РВК абмежаваліся дачай дырэктыў, мабыць, лічачы на гэтым сваю функцыю скончанай. Адным словам... «Інструкцыю або цыркуляр напісаў, спусьціў у калгасы і лічыць, што галоўнае зроблена, што справа цяпер сама пойдзе» (Постышаў).

Таму ня дзіва, што збожжа не паступае на закупачныя пункты і ўплывае на рынак.

Вінаваты ў гэтым РК і РВК, якія не правяралі, як выконваюцца дырэктывы, не арганізавалі масава-растлумачальнай работы на вёсцы.

Канторы Загатзбожжа даручана арганізаваць адзін закупачны пункт у горадзе. Райспажыўсаюз павінен адкрыць два пункты ў вёсках Бортнікі і Качэвічы. Папрабуйце знайсьці адказнага за арганізацыю пункту ў горадзе. Ня знойдзеце. Упаўнаважаны Загатзбожжа тав. **Ліякумовіч** лічыць, што яго справа—«кіраваць наогул».

— А хто адказвае за арганізацыю закупачнага пункту?

— Гэта не мая справа. Адказвае за гэта Рубінштэйн. Праўда, ён зараз на раёне.

Справа ясная. Тут пачуе саматёк.

Трэба сказаць, што Загатзбожжа ўсё-ж-такі нешта «робіць»: на рынку, на адным складзе зьявілася новая шыльда «Пункт Закупзбожжа». Памяшканьне ўпрыгожана добрымі лёзунгамі. Але вось бяда: на дзьвярах пункту пастаянна вісіць замкі. Збожжа ідзе на рынак, часта перападае ў рукі спэкулянта.

Для крамы пры закуппункце адпушчан рад дэфіцытных тавараў: 45 скрынак махоркі, 750 шт. хустак, звыш 150 пар абутку і боты і інш. Але няма куды завозіць гэтыя тавары, бо крама яшчэ будуецца.

Такое-ж становішча на сельскіх пунктах у Бортніках і Качэвічах.

Вывады ясныя: трэба па-баявому ўзяцца за арганізацыю закупак збожжа дзяржаве. Гэта неадкладная ўдарная задача.

П. Ч.

Збожжа самацёкам ня пойдзе

УВАРАВІЧЫ. (Наш спэцкар.). У Уваравіцкі раён поўнасьцю выканаў плян збожжазагатовак. Здавалася-б, што, выканаўшы заданьне, раённыя арганізацыі павінны былі, на аснове пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР, разгарнуць калгасны гандаль збожжам, галоўным чынам, дзяржаўным закупкі збожжа.

Але ў раёне нічога ня зроблена, каб пашуўлярызаваць пастанову ЦК і СНК. У Чэрапавіцкім сельсавеце можна пачуць ад калгасьнікаў такія пытаньні:

«Вось мы выканалі плян і засыпалі насеньфонды, ці можна нам прадаваць збожжа?»

Загадчык канторы Загатзбожжа тав. **Ткачоў** скардзіцца, што яму ніхто не дапамагае арганізаваць закупкі. Нам, старшыні РВК тав. Федзярэнка заяўляе: «Мы ўжо забыліся пра калгасны гандаль»:

Пасьля гэтага зразумела, чаму Уваравіцкі закупачны пункт за пяцідзеньку з 1 лютага закупіў толькі 51 клг. аўса, 8 клг. грэчкі. Адзін калгас «Чырвоныя ласкі» прадаў на рынку ў дзесяць раз больш збожжа, чым закупіў пункт ва ўсім раёне.

Такім чынам, у справе разгортваньня калгаснага гандлю і продажу збожжа дзяржаве панае сапраўдны самацёк.

У раёне можна пачуць гутаркі, што, засыпаўшы насеньфонды і размяркаваўшы ўраджай, калгасы ня маюць лішкаў збожжа. Гэта кулацкія размовы. Вось калгас «Чырвоныя ласкі». Івальскага сельсавету, прадаў 46 пудоў. У выніку адсутнасьці масава-растлумачальнай работы і слабай барацьбы з рвацкімі тэндэнцыямі, калгас прадаў збожжа цьвёрдазаданьнікам, а таксама на рынку, узяўшы па 80 руб. за пуд.

У. М.

Па-баявому праверым перабудову рабочага снабжэньня

Усім РКК-РСІ, райгазэтам і шматтыражкам, аддзелам рабочага снабжэньня, усім праўленьням ЗРК

ЦКК НК-РСІ, усесаюзная газэта «Снабжение, кооперация и торговля», рэдакцыі газэт «Зьвязда», «Савецкая Беларусь», «Рабочий» і прэзыдыум Белкаапсаюзу абвяшчаюць з 15 лютага 1933 году ДЭКАДНІК ПРАВЕРКІ РЭАЛІЗАЦЫІ ПАСТАНОВЫ ЦК І СНК АБ ПЕРАБУДОВЕ РАБОЧАГА СНАБЖЭНЬНЯ.

Мэта праверкі — МАБІЛІЗАВАЦЬ ПРАЛЕТАРСКУЮ ГРАМАДЗЯНСАЦЬ НА ДАПАМОГУ КААПЭРАЦЫЙНЫМ АРГАНІЗАЦЫЯМ у справе хутчэйшай рэалізацыі рашэньняў партыі і ўраду аб рэарганізацыі рабочага снабжэньня.

Для правядзеньня дэкадніку на фабрыках і заводах, дзе існуюць ЗРК і там, дзе арганізаваны аддзелы рабочага снабжэньня, ствараюцца праверачныя брыгады з прадстаўнікоў партыйных, камсамольскіх, прафэсыянальных, кааперацыйных арганізацый, заводакіраўніцтваў, ОРС'аў, органаў НК-РСІ, райгазэты і шматтыражкі.

Праверка праходзіць шляхам грамадзкага агляду, абмеркаваньня пытаньняў перабудовы рабочага снабжэньня на агульных і цэхавых сходах рабочых, збору рабочых прапаноў, выпуску спэцыяльных нумароў шматтыражак, насьценных газэт і бюлетэняў.

Вынікі праверкі абгаворваюцца на сходах рабочых і зацьвярджаюцца заводзкімі арганізацыямі. Вытворчыя нарады па рабочым снабжэньні, або спэцыяльна створаныя часова-кантрольныя камісіі сочаць за неадкладным правядзеньнем у жыцьцё вынікаў праверкі. Праверка ў асноўным праходзіць па наступных пытаньнях:

1. Як прайшла рэарганізацыя с

РАЗЬБІЦЬ ЗЛАЧЫННЫЯ ДЭМАБІЛІЗАЦЫЙНЫЯ НАСТРОІ на фронце ільназагатовак у Сеньненскім і Мсьціслаўскім раёнах

Чыю палітыку праводзяць Казлоўскія і Дуброўскія?

ОЯННО. (Наш спецкар.). 99,5 тоны добраякаснага ільнавалакна павінен быў здаць дзяржаве Беліцкі сельсавет. Задача баявая і адказная. Але сельсавет з ёй не справіўся. Плян.

Чаму гэта так? Толькі таму, што **кулацкі сабатаж яшчэ не разгромлен.** Ощ праўленьне клясава - варожых элементаў не ліквідавана.

Хіба ў сельсавеце не хапае сіл? Не! Актыў у сельсавеце не маленькі. Тры партыйныя ячэйкі — 30 камуністаў, 6 камсамольскіх ячэек — 150 камсамольцаў. 26 настаўнікаў, 160 студентаў тэхнікуму. 19 калгасаў, 2 саўгасы. Вось актыў, пры ўмове баявой работы якога сельсавет мог дабіцца першага месца ў раёне. Сіла вялікая. Але 75 процантаў яе не змагаліся за лён, за першынства сельсавету.

Як рыба аб лёд б'ецца сакратар Беліцкай парт'ячэйкі тав. **Міклушаў:** «Што я магу зрабіць адзін»—скарджыцца ён. Правільна, аднаму цяжка выранаць такія вялікія задачы. Трэба было мабілізаваць усе сілы. Трэба было кожнаму камуністу, кожнаму камсамольцу даць канкрэтныя заданьні на канкрэтным вучастку работы. Але гэта ня зроблена. Партыйная арганізацыя ня была мабілізавана на барацьбу за выраішэньне пастаўленых перад ёю задач. Ня было бальшавіцкай настойлівасьці, упартасьці, упэўненасьці ў свае сілы.

Вось чаму яшчэ ня зломлен кулацкі сабатаж у Беліцкім сельсавеце. Вось чаму сельсавет займае другое зьніву месца па Сененскім раёне.

Чаму так слаба паступае валакно? Няўжо праўда кажа старшыня калгасу «Новая Беліца» **Казлоўскі С.,** які цьвярдзіць аб «адсутнасьці ільну». Няўжо праўда за сакратаром Беліцкага сельсавету **Дуброўскім,** які прароча: «Нічога ня выйдзе, пляну ня выканаем, ільну няма».

Зусім на так! **Мовай Казлоўскага і Дуброўскага гаворыць кулак.** Лён паступае слаба толькі таму, што беліцкія камуністы і камсамольцы позна ўзяліся за работу (20 сьнежня), адразу не зрабілі рашучага націску на кулака, своячасова не ачысьцілі калгасы ад чужых элементаў.

А ў сельсавеце? І там сядзяць былыя людзі. Сакратар сельсавету **Рыгор Дуброўскі,** былы кулак з вёскі Запольле. Ён меў батраноў, трох коняй, 17 га зямлі і г. д. Перад уступленьнем у калгас ён усё разбазарыў, стаў «бядняком», а потым пралез у сельсавет. Гэты самы Дуброўскі ад многіх кулакоў браў хабар — парасят, за што ім абяцаў зьмешчыць цьвёрдае заданьне.

Сакратар ячэйкі тав. **Міклушаў** вядаў аб гэтым, але маўчаў, бо «няма кім замяніць».

Амаль у кожным калгасе ёсьць кулакі, іх не турбавалі. Яны спакойна праводзяць сваю лінію пад апекаю мясцовых перараджэнцаў. Вось, напрыклад, у калгасе «Запольле» 16 гаспадарак, сярод іх: былы стражнік Царэня, кулак **Прыстаўка,** кулак **Рыгор Дуброўскі,** заможнік **Барэйша Сьцяпан,** кулакі **Уласэвіч, Прыдавін** і інш. Калгас яўна кулацкі. Бедняком сьпяўляўся толькі старшыня праўленьня **Пракаповіч Іван.** Але і ён зрослся з кулакамі і разбазарваў лён. У выніку плян ільназагатовак па калгасу «Запольле» выканан на 35 проц. Недадана дзяржаве 24 центнеры. Між тым у гэтым калгасе і ў вёсцы Запольле роўна месяц сядзіць брыгадзір — старшыня Беліцкага рабкопу тав. **Лукашэвіч.**

З 18 калгасаў Беліцкага сельсавету толькі 8 выканалі заданьні. Некаторыя калгасы ўпарта сабатуюць загатоўкі. Калгас «Шумкі» павінен здаць 40,3 центн. ільнавалакна, здаў 8. Пяць центнераў завезьлі і ў калгасе «Глебаўск», якім кіруе т. **Палавінскі.** Зрываюць ільназагатоўкі калгасы «Дергайкі», (старшыня **Бурдо**), «Шылькі» (старшыня **Мурашэвіч**), Мінюцыва (старшыня **Салтановіч**).

Цьвёрдыя заданьні з кулацка-заможных гаспадарак не спатканы — кулакі замест 23 центнераў здалі толькі 11.

Аб тым, што ільну няма гаворыць і старшыня калгасу «Шылькі» Мурашэвіч. Між тым, у яго пры вобыску знойдзены два пуды ільнавалакна. Прыкладу старшыні сьледвалі і радавыя калгасьнікі, якія раскралі больш 10 центнераў. Усё гэта рабілася на вачох Беліцкай парт'ячэйкі і сельсавету (старшыня Жмыхаў).

Усе гэтыя факты паказваюць, да чаго прыводзіць апартуністычны самадзёк у рабоце, дэмабілізацыйныя настроі і нявер'е ў свае сілы.

Партарганізацыя Беліцкага сельсавету мае ўсе ўмовы, каб заваяваць перамогу ў ільназагатоўках.

В. СТАЛЬНОЎ.

Кулацкі сабатаж у Мсьціслаўшчыне ня зломлен

МСЬЦІСЛАЎЕ. Мсьціслаўскі раён, па водле пляну, павінен здаць 1.400 тон добраякаснага ільнавалакна. Кіраўніцтва раёну дагэтуль ня здолела выканаць пастаўленую перад ім баявую задачу—завяршыць загатоўкі да 1-га лютага.

Да тэрміну, вызначанага партыяй і ўрадам, плян ільназагатовак выканан па калгасах, якія абслугоўваюцца МТС, на 63,6 проц., па іншых калгасах—на 68,7 проц., па аднаасобным сэктарам—на 60,7 проц., па цьвёрдых заданьнях на 52,9 проц.

Адставаньне Мсьціслаўшчыны можна тлумачыць толькі тым, што шкодніцкая дзейнасьць клясава-варожых элементаў не ліквідавана дагэтуль.

Аб гэтым выразна сьведчыць работа Татаршанскага сельсавету, які знаходзіцца ў 5 кілёмэтрах ад раённага цэнтру. У калгасах гэтага сельсавету да апошняга часу арудавалі кулацкія элементы (калгасы «13-ты Кастрычнік», «Чырвоны сьцяг», «Ударная праца»). Месяц назад гэты сельсавет быў занесен на чорную дошку. І дагэтуль кіраўніцтва сельсавету нічога не зрабіла, каб дабіцца пералому.

Старшыня сельсавету **НОВІКАЎ** і сакратар парт'ячэйкі **ВЫБАРНЫ** абяцалі раённым арганізацыям выправіць дапушчаныя памылкі, але гэтыя абяцаньні не ажыцьцёўлены. Плян ільназагатовак па сельсавеце выканан на 48 проц., па цьвёрдых заданьнях на 53,3 проц.

Новікаў і Выбарны стаялі на шлях абароны кулакоў, скасаваньня штрафаў, на кладзеных на кулацка-заможныя гаспадаркі за невыкананьне пляну; яны ад значалі ў зводках, што цьвёрда-заданьнікі выканалі плян у той час, як апошнія сабатавалі загатоўкі.

РК і РКК пастанавілі зьняць з работы і аддаць пад суд Новікава і Выбарнага, як перараджанцаў, як ашуканцаў партыі. Гэтыя пастановы былі вынесены месяц назад, але дагэтуль Новікаў і Выбарны кіруюць Татаршанскім сельсаветам і сабатуюць загатоўкі.

Сакратар РК тав. **РАМАНЕНКА** супакойвае сябе тым, што раён выканаў пляны па ўсіх відах. «Толькі вось з ільном дрэнна».

— Чорт яго ведае, што здарылася з гэтым ільном, — гаворыць старшыня РВК тав. Кадукоў.

— Прахлопалі, ня выкрылі своячасова кулацкі сабатаж—у парыве самакрытыкі заяўляе старшыня РКК тав. **КАЖАРСКІ.** Самакрытыка—рэч добрая. Але што зроблена, каб выправіць дапушчаныя памылкі, каб ліквідаваць запазычанасьць у 460 тон ільнавалакна, якая яшчэ ёсьць дагэтуль. Вельмі мала! Да апошняга часу на чале раду сельсаветаў і партыйных ячэек стаялі перараджэнцы, якія абаранялі кулакоў, дапамагалі ім зрываць загатоўкі. Старшыня Малькаўскага сельсавету **ШЛЕЙФУС** увесь час выступаў супроць пляну, крычаў аб іх нерэальнасьці, аб тым што немагчыма выканаць цьвёрдыя заданьні. У выніку па аднаасобным сэктары сельсавету плян па ільну выкананы толькі на 52,6 проц.

Загадчык райза **СТАРАСЬЦІН** і старшыня райкалгасаюзу **Дамброўскі** замест таго, каб праверыць, як выкананы пасеўныя пляны па сельсаветах і калгасах, займаліся штампаваньнем рапортоў аб 100 проц. выкананьні пляну сяўбы ільну. Між тым, рад калгасаў не засеялі дзесяткі гектараў. Калгас імя Чарвякова замест 52 га засеяў толькі 35, калгас «Зьвязда» недасеяў 32 га. У выніку—гэтыя калгасы ейчаць зараз аб непасільнасьці пляну. Штампоўшчыкі і ашуканцы, якія ў мінулым годзе выступалі з пераможнымі рэляцыямі, каб апраўдаць прарыў у выкананьні пляну загатовак, крычаць зараз аб тым, што быў недасеў, што заданьні нерэальныя.

Нельга сказаць, што ў Мсьціслаўшчыне ня ўжывалі рэпрэсіі у адносінах кулакоў і сабатажнікаў. Многіх судзілі, прыгаварылі да суровых мер пакараньня. Але справа ў тым, што часта білі па вераб'ёх, не заўважваючы зпосных сабатажнікаў і кулакоў. Былы старшыня калгасу «Савецкая Беларусь»—Вінікаў, які разбураў калгас, сабатаваў ільназагатоўкі, прыгавораны толькі да паўтара год зьняволеньня. Ня дзіўна, што пасьля такога «жорсткага» прыгавору, ён, усьміхнуўшыся, сказаў «Глупства, і там хлебам кормяць».

Рад перараджэнцаў выключаны з радоў партыі. Але вялікая колькасьць іх дагэтуль працуе на ранейшых пасадах і трымае партыйныя білеты ў кішэнях. Трэба было даўно ўжо выкінуць з партыі і асудзіць за сабатаж сакратара парт'ячэйкі Татаршанскага сельсавету **ВЫБАРНАГА,** але дагэтуль бюро РК і прэзыдыум РКК дыскусуюць: ці трэба выключаць з партыі Выбарнага—праховста і кулацкага перараджэнца.

Зусім не разгорнута партыйна-масавая работа, у той час, як у раёне налічваецца 20 вясковых парт'ячэек. Такі вагар масавай работы, як камсамол (у раёне налічваецца 2.000 камсамольцаў) ня быў скарыстаны для ўзмацненьня тэмпаў ільназагатовак.

Запытайцеся ў раённых кіраўнікоў—ці мабілізован актыў на ільназагатоўкі, вы пачуеце адказ: «160 чалавек сядзяць у вёсках». Правільна, сядзяць, але што яны робяць—вось пытаньне. Брыгадзір ЦК КП(б)Б тав. **ХЭУЛІН** пацьвярджае, што камандзіраваныя з раёну работнікі бязьдзейнічаюць, бо іх работы ніхто не правярае.

Вывады з усяго вышэй сказанага наступныя: **КУЛАЦКІ САБАТАЖ У МСЬЦІСЛАЎШЧЫНЕ НЯ ЗЛОМЛЕН.** Аб гэтым гавораць лічбы, гэта пацьвярджаюць факты.

ЯН.

Чорная дошка

Пастановай ЦК КП(б)Б і СНК БССР занесены на чорную дошку наступныя раёны:

ЗА ЗРЫЎ ЗАГАТОВАК ІЛЬНУ:

ТАЛАЧЫНСКІ (сакратар РК тав. **Славін,** старшыня РВК тав. **Лагераў**).

СЕНЬНЕНСКІ (сакратар РК тав. **Дашуневіч,** старшыня РВК тав. **Себісевіч.***)

СІРОЦІНСКІ (сакратар РК тав. **Усенка,** старшыня РВК тав. **Ражноўскі.***)

За зрыў загатовак усіх відаў занесены на чорную дошку наступныя сельсаветы:

па **Бягомльскім раёне:** Дамбражыцкі сельсавет; па **Чашніцкім раёне:** Стражавіцкі; па **Клічаўскім:** Віркаўскі; па **Сураскім:** Камароўскі; па **Аршанскім:** Буеўскі; па **Пухавіцкім:** Гарэліцкі. Слабодзкі, Задашчанскі і Шацкі; па **Вушацкім раёне:** Ісайскі; па **Мсьціслаўскім раёне:** Татаршанскі сельсавет.

*) **Упаўнаважаныя ЦК па Сененскім і Сіроцінскім раёнах т. т. БЕРЗІН і ВІЛЬЧАК** зьняты з чорнай дошкі, як зьнятыя з пасады ўпаўнаважаных з прыцягненьнем да прыватнай адказнасьці.

Лесазагатоўкі

АЧЫСЬЦІЦЬ АПАРАТ ЛЕСПРАМГАСАЎ АД КЛЯСАВА-ВАРОЖЫХ ЭЛЕМЭНТАЎ

За прыгожымі фразамі Рохліна хаваецца кулацкі сабатаж

Апарат Рэчыцкага леспрамгасу налічвае шмала лішніх адзінак у сваім штаце. Аплачваецца ён дзяржаваю ня лішні стаўкамі і забясьпечваецца нядрэнна. А вось студзеньскае заданьне па загатоўцы дзелавой драўніны выканана па леспрамгасе ўсяго толькі на 14,3 проц., па загатоўцы дроў на 10,6 проц. Вывезена за студзень 9,2 проц. будаўнічага матар'ялу і 10,4 проц. дроў. Рэчыцкі раён апынуўся зноў у ліку самых адсталых.

Апарат леспрамгасу літаральна нічога не рабіў. Работнікі прарабскіх вучасткаў разважалі «няхай канчаюць з загатоўкамі, а з лесам мы яшчэ пасьпеем, дый сьнегу малавата. Можа падсыпле крыху, а то дзядзькі ня хочуць ехаць». Дагаворы з калгасамі ня былі заключаны. За дапамогай у сельсаветы леспрамгас не зварачаўся.

Толькі тады, калі фанэрны завод з-за адсутнасьці вольнай апынуўся пад пагрозай спыненьня работы, пад напорам тэлеграм з Менску райком КП(б)Б з усёй вострасьцю паставіў пытаньне лесазагатовак і вывазкі перад работнікамі леспрамгасу, сельсаветамі і ячэйкамі. Эрух у рабоце канчаткова разьбіў апартуністычнае ніць цё работнікаў леспрамгасу, што нічога нельга зрабіць, бо дрэнная дарога, дрэнныя коні і няма калёс. Знайшліся і людзі, і коні, і калёсы. Выезд у лес з 400 фурманак павялічыўся да 3.691.

Але і зараз узорам бязьдзейнасьці і непаваротлівасьці можа служыць Горвальсні вучастак, на чале з апартуністам Рохліным.

4 лютага была склікана вытворчая нарада работнікаў Горвальскага вучастку. Да 7 гадзін вечара зьявілася толькі 50 проц. людзей. Адразу відаць «мабілізаванасьць» работнікаў вучастку. З першых-жа слоў апартуніста **Рохліна** відаць, што людзі навучыліся хаваць сваю бязьдзейнасьць за прыгожай фразай.

— 7 студзеня мы з вамі далі абяцаньне ня зьбіраццa палучь ня выкананым пляну на 100 процантаў. Прайшоў месяц і мне прышлося вас сабраць, бо работа ідзе вельмі дрэнна. На 1 лютага квартальны плян загатоўкі выканан на 11,8 проц., вывазкі — на 4,1 проц. Гэта поўны крыў, — кажа Рохлін. — Нашым зводкам нельга верыць, бо мы іх бяром са столі.

Рохлін расьпінаўся больш гадзіны, але пытаньне: што-ж зроблена, хто зрывае загатоўкі і вывазку — труба спыніла яго прамову. На гэта пытаньне **Рохлін** адказвае, што ён ня мае над рукамі лічбаў і наогул не займаецца іх зьбіраньнем. З сельскімі саветамі вучастак не зьвязваўся, там паваг ня ведаюць работнікаў апошняга. На працягу чатырох месяцаў з калгасамі заключана толькі 9 дагавораў. Ні адзін заможнік з прымацаваных да вучастку **Дзюрдзеўскага і Баравікоўскага** сельсаветаў не прыступіў да выкананьня цьвёрдых заданьняў. А кулакоў налічваецца па гэтых сельсаветах 50.

Усьлед за Рохліным выступіла цэлая галярэя кулацкіх агентаў — работнікаў апарату Горвальскага вучастку.

— Мы загатовілі на сваім вучастку 1.500 кубаметраў драўніны, што складае 2,3 проц. пляну, а да вывазкі прыступілі толькі сёньня. Бачыце, ва ўсім вінаваты сельсаветы, бо яны не высылаюць фурманак, — кажа технік **Паклонскі.**

— А вы што зрабілі? — Я... я бываў у сельсаветах.

Толькі апошнія пяць дзён ідуць фурманкі, а то было ня больш 15-20. Ну, я болеў нічога не рабіў. Што я буду рабіць? Калі-б прывозілі, дык я прымаў-бы, — кажа прыёмшчык на прыстані Гагалі **Кунін.**

— Я,—кажа культпагледчык **Гром,** — быў упаўнаважаным па Дзюрдзеўскім сельсавеце, але не магу сказаць, што зроблена там, бо мне не даручалі зьбіраць вестак. Іх зьбірае технік.

Апарат леспрамгасу, атрымаўшы суровае папярэджаньне ад райкому партыі, заблытаўся і ня ведае дзе і што трэба рабіць. Патрабуюць фурманкі, у той час, як патрэбны лесарубы. **Жмураўскі** сельсавет на патрабаваньні вучастку 6 лютага выслаў 142 фурманкі, а аказалася, што няма чаго вазіць. Сваёю блытанінай леспрамгас стварае сярыяючыя ўмовы для работы клясавага ворага.

Рэчыцкі райком і РКК-РСІ павінны з бальшавіцкай рашучасьцю ўзяцца за чыстку апарату леспрамгасу і ўгатаваць яго людзьмі.

Дашкевіч.

У графе „выкананьне"—пустое месца...

Перад намі зводка Аршанскага леспрамгасу аб выкананьні цьвёрдых заданьняў па лесазвазе кулацка-заможнымі элемэнтамі на 1 лютага. Гэта зводка — яркі дакумант абвостранай клясавай барацьбы вакол лесазвазак, узмоцненага супраціўленьня кулацка-заможных элемэнтаў, арганізаванага кулацкага сабатажу.

Стайкаўскі прарабскі вучастак яднае 5 сельсаветаў, якія павінны вывезьці па цьвёрдых заданьнях: лесаматар'ялу 1.110 кбм., дроў — 395 кбм. Але ў графіку «выкананьне» — пустое месца. Да 1 лютага кулацка-заможныя элементы ня вывезьлі ні аднаго кбм. лесу.

Па **Копыскім** прарабскім вучастку цьвёрдыя заданьні выкананы па лесаматар'ялах на 1,2 проц., дроў ня вывезена ні аднаго кубаметра.

Па **Смальлянскім** тэхнічным вучастку вывезена па цьвёрдых заданьнях толькі 10 раўмэтраў дроў; лесаматар'ялу з 700 кбм., вызначаных пляном, ня вывезена ні аднаго кубаметра.

Па **Аршанскім** тэхнічным вучастку цьвёрдыя заданьні па лесаматар'ялах выкананы на 0,6 проц., дроў ня вывезена ні аднаго раўмэтра.

Гэтыя лічбы — сьведкі таго, што ў Аршанскім раёне кулацкі сабатаж лесазвазак не знаходзіць рашучага адпору з боку раённых арганізацый і сельсаветаў, што тут адносяцца ліберальна да кулака. Даволі сказаць, што да гэтага часу ня было ні аднаго выпадку прыцягненьня да судовай адказнасьці за зрыў лесазвазкі.

Кулацкі сабатаж знаходзіць свой адбітак і ў радзе калгасаў, дзе на лесазвазкі глядзяць, як на «чужую» справу і імкнуцца тым ці іншым спосабам ад яе ўхіліцца. Вось, для прыкладу, калгасы **«Новае жыцьцё»** і **«Ясная паляна»,** Стайкаўскага сельсавету. Тут забываюцца аб сваіх абавязках, аб выкананьні заключаных дагавораў. Тут імкнуцца толькі як мага больш урваць ад дзяржавы, але даць ёй як мага менш.

У калгасах **імя Варашылава, «Новае сяло», Межаўскага** сельсавету, **«Расьсьвет»,** Ляўшэвіцкага сельсавету, **«Ленінскі шлях»,** Багушэўскага сельсавету, **«Свабода»,** Шаткаўскага сельсавету, **«Новы сьвет»,** Высоцкага сельсавету і інш. Праўленцы таксама імкнуцца ўхіліцца ад лесазвазкі, зрываюць работу.

А леспрамгас адносіцца мякка да гэтых калгасаў, ня прыцягвае да адказнасьці за парушэньне дагавораў. Што-ж карыснага ў тым, што фармальна леспрамгас заключыў з калгасамі 168 дагавораў, паводле якіх палічны штодзённа выяжджаць на лесазвазку 1.385 фурманак. Гэтыя дагаворы ў значнай частцы застаюцца выключна на паперы.

Сабатаж загатовак і вывазкі лесу прыкрываўся ўвесь час «аб'ектыўнай» прычынай — адсутнасьцю санная дарогі. Але вось санная дарога ўстанавілася, а бязьдзейнасьць у радзе сельсаветаў працягваецца, як і раней. Будзкі сельсавет, напрыклад, ня вывез ні аднаго кубаметра лесу да ўстаноўленьня санной дарогі і злачынна зрывае заданьне пасьля яе ўстаноўленьня. **Шыбецкі** сельсавет павінен вывезьці 700 кбм. лесаматар'ялу і 300 раўмэтраў дроў, а дагэтуль ня вывез ні аднаго бервяна. Веранскі сельсавет таксама ня вывез ні аднаго кубаметра лесаматар'ялу і дроў.

Да апошняга часу ў сельсаветах і калгасах існавала абураючая канкурэнцыя пры вярбоўцы рабочай сілы паміж розныміарганізацыямі. Леспрамгас, Белдрэс, Белбудкантора злачынна перавышалі ўстаноўленыя Наркампрацы расцэнкі на вывазку лесу, каменьня, торфу і інш. Так, напрыклад, замест 2-х рублёў за вывазку аднаго кубаметра каменьня вярбоўшчыкі абяцалі па 5-12 руб. за кубаметр, а іншы раз, пры адлегласьці ў 4—5 клм., расцэнкі былі і значна вышэйшыя. Прараб вуцюру плацілі нават за вывазку аднаго кубаметра каменьня 27 руб.

За перавозку торфу перавышэньне расцэнак на мясцох даходзіла да 400—500 проц. Гэтыя факты даводзілі да агіднай канкурэнцыі і ажыятажу ў вярбоўцы рабочай і цягавай сілы. Раённыя арганізацыі не прынялі своячасова рашучых мер для ліквідацыі гэтых агідных зьяўшч. І толькі 5 лютага райштаб па лесавывазцы прапанаваў усім арганізацыям, перавысьўшым расцэнкі на вывазку матар'ялаў, скасаваць усе заключаныя дагаворы і перазаключыць іх у рамках, устаноўленых Наркампрацы расцэнак. Чаму-ж нельга было зрабіць гэтага раней?

* * *

На працягу першага кварталу Аршанскі леспрамгас павінен вывезьці паводле пляну 60 тыс. кбм. лесаматар'ялу і 26 тыс. раўмэтраў дроў. З гэтай колькасьці 25 проц. трэба было вывезьці ў студзені. Але студзень прайшоў са значным прарывам, асабліва па вывазцы лесаматар'ялаў. Квартальны плян быў выканан за месяц па лесаматар'ялах на 0,7 проц., па дровах — на 31 проц.

У першай дэкадзе лютага намецілася поўны пералом. Прырост за гэтыя дзесяць дзён складае 23 проц. квартальнага пляну па дровах і 36 проц. па лесаматар'ялах. Але ўсё-ж тэмпы лесавывазкі яшчэ не забясьпечваюць поўнага выкананьня квартальнага пляну.

Задача раённых арганізацый — поўнасьцю ліквідаваць прарыў, забясьпечыць 100 процантае выкананьне пляну першага кварталу. Гэта магчыма толькі пры ўмове мабілізацыі ўвагі шырокіх мас калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў вакол лесавывазкі, пры канчатковым разгроме кулацкага сабатажу.

Выязная рэдакцыя «Зьвязды»:
Б. ПАПОЎ, С. ГАЛКІН.

Усебеларускі конкурс на чыгуначным транспарце

У ВІЦЕБСКІМ І ЖЛОБІНСКІМ РАЁНАХ КОНКУРС ПАД ПАГРОЗАЙ ПРАВАЛУ

Задача партарганізацый—дабіцца пералому ў рабоце транспарту

ТРЫВОЖНЫЯ ВЫНІКІ

Зараз перад чыгуначным транспартам пастаўлены выключна-важныя задачы. У бліжэйшыя дні пачынцца масавыя перавозкі пасеўных грузаў. Ад выраішэньня бесьперабойнай работы чыгункі залежыць своячасовая дастаўка сельгаспрадукцыі палём сельска-гаспадарчых машын, гаручага, насеньня і г. д. — іншымі кажучы, залежыць посьпех бальшавіцкай вясны першага году другой пяцігодкі.

Вынікі работы чыгункі БССР за студзень зьяўляюцца трывожнымі. Замест паляпшэньня, чыгунка працавала ў студзені горш, чым у сьнежні.

Большасьць асноўных вымяральнікаў ня выкананы. Асабліва адстаюць **Віцебскі і Жлобінскі** раёны. Хворых паравозаў у Віцебскім раёне пры заданьні 12,3 проц. было ў студзені 14,9, у Жлобінскім раёне за трэцюю дэкаду студзеня пры заданьні 15,8 было 16,6 проц. Зварот вагона ніжэй заданай нормы па ўсіх раёнах, асабліва ніскі процант выкананьня па **Аршанскім** (87,39) і **Жлобінскім** раёне (89,37). Значна ніжэй заданай нормы таксама сярэдня-сутачны прабег таварнага вагона: па Аршанскім раёне 76,5 проц і Віцебскім раёне 88,1 проц. У тэтых-жа раёнах ня выкананая норма работы таварнага вагона ў гадзінах. Процант маршрутызацыі цягнікоў не дасягае нормы ва ўсіх без выключэньня раёнах.

Важнейшы паказальнік — норма сярэдня - сутачнай нагрузкі, апрача **Жлобінскага** раёну ніжэ ня выконваецца.

Зусім трывожнае становішча са **сьледваньнем цягнікоў па раскладу.** Так, па Віцебскім раёне сьледваньне таварных цягнікоў па раскладу выкананa на 44,9 проц., а пасажырскіх на 79,9 проц., у Жлобінскім раёне — таварных цягнікоў на 68 проц. Мала лепш і ў Аршанскім раёне.

Гэтыя факты сьведчаць перш за ўсё аб тым, што пытаньню паляпшэньня якасьці — цэнтральнай задачы, пастаўленай у сучасны перыяд студзеньскім пленумам ЦК і ЦКК УсеКП(б)—яшчэ няма належнай увагі. Між тым, рашаючай умовай выкананьня чыгункаю баявых задач першага году другой бальшавіцкай пяцігодкі зьяўляецца барацьба за высокую якасьць, за бесьперабойнае і ніўкільнае выкананьне асноўных якасных вымяральнікаў.

Па-ранейшаму застаецца на нізкім узроўні працоўная дысцыпліна. У выніку гэтага лік здарэньняў у студзені нікольні не паменшыўся. 474 здарэньні на чыгунцы БССР — сьведка адсутнасьці бальшавіцкай барацьбы за сацыялістычную дысцыпліну на транспарце. Віцебскі раён (189 здарэньняў) і Жлобінскі раён (116) і тут пабіваюць «рэкорды» сваімі ганебнымі паказальнікамі.

Паказныя агульныя вынікі работы чыгункі БССР за студзень нельга разглядаць ізалявана ад таго конкурсу паравозных і вагона-рамонтных брыгад, які зараз праходзіць на транспарце. Здавалася, і так павінна было быць, што конкурс дапаможа ўздыму работы на ўсіх вучастках, падцягне адсталыя зьвенні. Аднак, агульныя вынікі і вынікі работы паравозных і вагона-рамонтных брыгад і дэпо, прымаючых удзел у трэцім усебеларускім конкурсе, паказваюць, што барацьба за першынства праходзіць яўна недавальняюча, што на мясцох ёсьць простая палітычная недацэнка конкурсу.

У другую палову студзеня мелі эканомію апалу толькі 18 паравозаў (85.781 клгр.) у той час, калі ў першай палове мелі эканомію 26 паравозаў (168,298 клгр.). Перарасход апалу ў другой палове студзеня мелі 4 паравозы (13.750 клгр.) Жлобінскага, Магілёўскага і Гомельскага дэпо. Перапрабег нормы кілёмэтраў маюць толькі 14 паравозаў, а недапрабег — 8 (Менскае, Аршанскае, Магілёўскае і Віцебскае дэпо). Эканомію па гаспадарчым разрахунку ў студзені мелі толькі 10 паравозаў у сярэднім па 11,13 проц., а перавыдатак мелі адзінаццаць паравозаў на 26,9 проц.

Ня лепш справа і па вагона-рамонтных брыгадах. Тут таксама назіраецца пагаршэньне работы.

Няма пералому і ў рабоце конкурсных дэпо за студзень. Хворых паравозаў на ўсіх дэпо больш, чым прадугледжана па норме.

Ёсьць паніжэньне і процанту выкананьня спаранай. Асабліва дрэнна стаіць справа з гэтым па Жлобінскім раёне і па дэпо Віцебск.

Райжуры і раённыя арганізацыі фармальна падыходзяць да сваёй работы і выяўленьні прычын, што тармозяць работу, ня робяць аналізу паасобных вучасткаў работы, не мабілізавалі масы і самі не мабілізаваліся як належыць на пасьпяховае правядзеньне конкурсу. Неадпаразовыя ўказаньні аб гэтым з боку цэнтральнага журы ўсебеларускага конкурсу не пасьлухалі для пералому ў рабоце.

Гаркомы і райкомы КП(б)Б і райпрафсаветы да гэтага часу не дапамагаюць транспартным арганізацыям у правядзеньні конкурсу. Шэфы конкурсных паравозаў, дэпо і вагона-рамонтных брыгад у большасьці ня выканалі сваіх самаабавязацельстваў.

Журы ўсебеларускага конкурсу па сваім апошнім пасяджэньні, разглядаючы вынікі конкурсу за другую палову студзеня, прызнаў іх сумнымі дрэннымі, яны сьведчаць аб небяспецы правалу конкурсу.

Задача зараз заключаецца ў тым, каб час, што застаўся да фінішу, сапраўды па-ўдарнаму скарыстаць і дабіцца ліквідацыі гэтых ганебных недахопаў.

Работа паравозаў—удзельнікаў трэцяга ўсебеларускага конкурсу за другую палову студзеня

Таварныя

Месца якое заняў		лік балаў
1.	Щ-16, Літошка і Пятрова (дэпо Полацак)	149,56
2.	Щ-362, Гулецкага і Ігнатовіча (дэпо Ворша)	130,5
3.	ОК-6739, Сакалоўскага і Вашкевіча (дэпо Асіпавічы)	118,13
4.	Щ-336, Высоцкага і Любецкага (дэпо Ворша)	107,2
5.	Щ-5066, Чэхава і Нефядовіча (дэпо Гомель)	106,3
6.	ОВ-5441, Пазьневіча і Сокалава (дэпо Асіпавічы)	102,97
7.	Щ-19, Гарэлага і Лукомскага (дэпо Гомель)	60,14
8.	Щ-1551, Хромава і Гетуна (дэпо Гомель)	48,72
9.	Щ-2026, Салаўёва і Зайцава (дэпо Магілёў)	38,45
10.	Щ-3004, Нікіціна і Мідзіна (дэпо Віцебск)	33,2
11.	Э-18, Шчэрбачонка і Паттарова (дэпо Віцебск)	23,6
12.	Щ-3523, Арлоўскага і Шацілы (дэпо Жлобін)	16,21
13.	ОВ-4877, Касьцюковіча і Лёўковіча (дэпо Менск)	1

Адстаючыя

Щ-3567, брыгада Пархамовіча і Чартоцкага (дэпо Магілёў), атрымаў мінус 62,84.

Э-215, брыгады Токарава і Рушынга (дэпо Віцебск) атрымаў мінус 26,5 бала.

Выключан з конкурсу

Паравоз ОВ-5082 брыгады Галавача і Наварая (дэпо Калінкавічы) пастановай цэнтральнага журы выключан з конкурсу, як папаўшы ў крушэньне.

Пасажырскія

1. СУ-9766, Дайнэка і Алексеева (дэпо Ворша) 231,15
2. СУ-9875, Бушэйка і Гуляева (дэпо Ворша) 216,65
3. С-331, Кандыба і Мацкевіча (дэпо Гомель) 152,75
4. С-303/2, Барадзіна і Самадума (дэпо Гомель) 141,63
5. СУ-200-94, Баранчыка і Вятрова (дэпо Менск) 141,2
6. НУ-218, Кутырла і Бондарава (дэпо Магілёў) 37,73

Паравоз ОВ-4183 Маляўкі і Падбелы (дэпо Ворша) атрымаў плюс 262 балы, але з прычыны таго, што працаваў у прыгарадным руху, ён ня можа быць уключан у калёну конкурсных таварных паравозаў.

Работа вагонна-рамонтных брыгад—удзельнікаў ўсебеларускага конкурсу за другую палову студзеня

Па сваіх, вытворчых паказальніках вагона-рамонтныя брыгады занялі месцы:

1-ае месца брыгада Грычанава (вагоннае дэпо Гомель), складаецца з 4 чалавек, атрымала 669 балаў;

2-ое месца брыгада Сапрыка (вагоннае дэпо Гомель), складаецца з 3-х чалавек, атрымала 649 балаў;

3-ае месца брыгада Хамякова (дэпо Жлобін), складаецца з 4-х чалавек, атрымала 564 балы;

4-ае месца брыгада Градзюшкі (вагоннае дэпо Ворша), складаецца з 4-х чалавек, атрымала 438 балаў;

5-ае месца брыгада Алексеева (вагоннае дэпо Віцебск), складаецца з 3-х чалавек — 290 балаў;

6-ае месца брыгада Баяровіча (вагоннае дэпо Менск), складаецца з 3-х чалавек, — 70 балаў;

7-ае месца брыгада Быкава (дэпо Жлобін), складаецца з 7 чалавек, атрымала 43,82 бала.

НАПЯРЭДАДНІ 15-й ГАДАВІНЫ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

МЕНСК.

* У лютым ВСФКБ арганізуе УСЕБЕЛАРУСКІ ВАЯНІЗАВАНЫ ЛЫЖНА-ЗЬВЁЗДНЫ ПРАБЕГ, прысьвечаны 15-й гадавіне Чырвонай арміі.

* У адзнаку 15-й гадавіны РСЧА Мектаркомам партыі ўстаноўлен ПЕРАХОДНЫ ЧЫРВОНЫ СЬЦЯГ імя гаркому КП(б)Б, гарсавету, гарпрафсавету і гарсавету Асоавіяхіму прадпрыемству за лепшую пастаноўку абарончай работы — выкананьне прамфінпляну па ўсіх паказальніках, шэфработа ў калгасе, у МТС, МТМ, выкананьне ўсіх мар шрутаў варашылаўскай эстафэты. Перадача пераходнага чырвонага сьцягу прыстасоўваецца да палітмасоўні і фінішу варашылаўскай эстафэты — 24 лютага.

* У клюбе імя Сталіна ў Менску адбыўся ЗЬЛЁТ ДАПРЫЗЫЎНІКАЎ, прысьвечаны 15-й гадавіне Чырвонай арміі. У зьлёце прымала ўдзел звыш 700 чалавек. Зьлёт зьвярнуўся з адозвай да ўсіх дапрызыўнікаў БССР, у якой заклікае быць лепшымі ўдарнікамі на вытворчасьці і па ўзмацненьні абарончай работы.

* Па Менску скончылася ПЕРАВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ ЯЧЭЕК АСОАВІЯХІМУ, якая прайшла пад кутам гледжаньня ўзмацненьня асоавіяхімаўскай работы на вытворчасьці і падрыхтоўкі да юбілею Чырвонай арміі. У сувязі з перавыборамі асоавіяхімаўская арганізацыя Менску ўзрасла на 7.000 членаў. Арганізавана 90 стрэлковых гурткоў, якія праводзяць стрэлковыя спаборніцтвы, прысьвечаныя гадавіне Чырвонай арміі.

* Сёньня, 16 лютага па ініцыятыве менскага дому Чырвонай арміі арганізуюцца АГУЛЬНА-ГА

Абвастрэньне нямецка-францускіх супярэчнасьцяй

Разрыў мытнай згоды паміж Германіяй і Францыяй

БЭРЛІН, 14. Германскі ўрад парваў, пачынаючы з 1 сакавіка 1933 году, мытную згоду з Францыяй, якая датычыць расу аграрных і прамысловых прадуктаў, што ўвозіліся з Францыі. У афіцыяльным паведамленьні гаворыцца: «кіруючыся імкненьнем па магчымасьці ўнікнуць уцясненьня пераходу ў галіну нямецка-францускага тавараабмену, германскі ўрад абмежаваўся толькі тымі таварамі, у адносінах да якіх ёсьць асаблівая патрэба казасобных галін нямецкай гаспадаркі, што робіць разрыў мытнай згоды абсалютна неабходным». У 1932 годзе экспарт закранутых гэтых мерэю германскага ўраду францускіх тавараў у Германію склаў **звыш 36 млн. францускіх франкаў** (ТАСС).

Гітлер патрабуе звароту калідору

БЭРЛІН. 14. Блізкая да ўраду «Берлінэр Бэрзэн Цэйтунг» учора вечарам, ужо пасьля зьяўленьня абвяржэньня інтэрв'ю Гітлера з прадстаўніком «Сэндэй экспрэс», надрукавала інтэрв'ю у яго першапачатковым выглядзе.

Камэнтуючы гэта інтэрв'ю, газэта пісала: «У гэтым інтэрв'ю Гітлер выказаўся па важнейшых пытаньнях германскай замежнай палітыкі. Ён зрабіў гэта ў надзвычайнай і адкрытай форме, таму ня дзіва, калі яго заява выклікала найвялікшую ўвагу ў першую чаргу ва Францыі, па адрасе якой галоўным чынам гэта заява і была зроблена. Гітлер падаў у простай і зразумелай форме патрабаваньні Германіі па пытаньнях ваенна-палітычнага роўнапраўя, рэвізіі вэрсальскага дагавору, звароту польскага калідору і справядлівага вырашэньня калёніяльнай праблемы. Блізкі да ўраду орган «Оталёвага шлему», «Крэйн Цэйтунг» гэтаму паведамленьню даў заголавак: «Гітлер патрабуе звароту калідору».

Рэзкія выпады польскай прэсы супроць Гітлера

ВАРШАВА, 13. Эндэцкая газэта «А. Б. Ц.» зьмяшчае рэзкі артыкул, накіраваны супроць Гітлера ў сувязі з яго інтэрв'ю ў «Сэндэй экспрэс». Артыкул мае загаловак: «Правакатар». Газэта піша: «Адольф Гітлер праявіў сябе раней, чым можна было чакаць. Гітлер дасканала ўяўляе, што любая спроба вымены граніц Польшчы нямінуча скончыцца вайной і таму яго апошнюю дэкларацыю мы ня можам разглядаць інакш, як правакацыю».

Уся польская грамадзкасьць, — піша **«А. Б. Ц.», чакае ад польскага ўраду безадкладнага адказу на правакацыю канцлера Гітлера.**

Бэрнард Шоу заклікае моладзь вывучаць камунізм

ШАНХАЙ, 14. Бэрнард Шоу прыбыў у Ганконг. У прамове на сходзе студэнтаў унівэрсытэту, Шоу заклікаў студэнтаў: «Пагрузіцца па-горла ў вывучэньні камунізму.

Выдатныя амэрыканскія банкіры і прамыслоўцы—за перагляд вэрсальскага дагавору

ВАШЫНГТОН, 13. Сэнацкая фінансавая камісія запрасіла 55 найбольш выдатных банкіраў і прамыслоўцаў выказаць свой пункт погляду на прычыны эканамічнага крызісу і сродкаў барацьбы з імі. **Бэрнард Барух** — Н'ю-ёркскі фінансыст, дарадца Гувэра і Рузьвэльта, дадочы свае ўказаньні ў камісіі, выказаўся **за перагляд вэрсальскага дагавору.** Па словах Баруха вэрсальскі мірны прадыктован пад дулам гармат і яго санкцыі **пацярпеў крах.** Барух заявіў далей, што пытаньне аб сілезкай граніцы, польскім калідоры і Саарскай вобласьці, а таксама многія этычныя пытаньні і пытаньні аб граніцах неўрэгуляваныя або дрэнна ўрэгуляваныя вэрсальскім дагаворам, зьяўляюцца спраўднай прычынай вялізарных узбраеньняў, пад цяжарам якіх зьнемагае сьвет, а таксама прычынай большасьці штучных гандлёвых бар'ераў.

Забарона левых газэт

БЭРЛІН, 14. Паліцэй-прэзыдэнтам забаронена на 14 дзён левая **«Бэрлін ам морген».** Прычынаю забароны зьявілася надрукаваньне інтэрв'ю з прадстаўніком камфракцыі рэйхстагу **Торглерам** аб адзіным фронце і артыкулу з заклікам да барацьбы за свабоду друку і сходаў. На 5 дзён забаронена камуністычная газэта **«Турынгэр фольксблят»,** якая выходзіць у Эрфурце.

Забаронена тэрмінам на два тыдні **«Ді Шварцэ фронт»**—орган групы Отэштрасэра, якая адкалолася ад цацыянал-сацыялістаў, на 53 дні забаронена газэта партыі цэнтру «Нойэсэр цэйтунг».

Новае наступленьне прадпрыемцаў на зарплату ў Польшчы

ВАРШАВА, 13. Паводле вестак Катовіцкай «Палёніі», саюз прамыслоўцаў Верхняй Сілезіі мае намер у бліжэйшыя дні **абвясьціць аб скасаваньні калдагавору і зьніжэньні зарплаты гарняком на 15 проц. і мэталістам на 25 проц.** Адначасова адбываюцца далей масавыя звальненьні і прымусовыя «водпускі» без захаваньня зарплаты на капальнях і мэталюргічных заводах. У Келіцкім ваяводзтве **з 22 рудных капалень працуюць зараз толькі 3,** прычым адной пагражае закрыцьцё ў бягучым месяцы. Масавыя звальненьні праводзяцца таксама сярод нафтанікоў.

Пэпээсаўскі **«Роботнік»** з трывогай палкрысьлівае рост рэвалюцыйных настрояў сярод рабочых і беспрацоўных у прамысловых цэнтрах. «Ва ўсіх вугальных і нафтавых басэйнах, — піша «Роботнік», чуцён грозны гул». Фашысцкі і сацыял-фашысцкія прафбюракраты праяўляюць узмоцненую актыўнасьць, імкнучыся «левымі» манэўрамі перахапіць кіраўніцтва забастовачнымі баямі, якія набліжаюцца.

Учора ў Катовіцах адбыліся тры вьезды: зьезд дэлегатаў пэпээсаўскага саюзу гарнякоў, зьезд фашысцкіх саюзаў «Эспул працы» і пасяджэньне галоўнага кіраўніцтва прафсаюзаў Маравяўскага. На нарадзе пэпээсаўскага саюзу прынята рэзалюцыя аб абвяшчэньні ўсеагульнай забастоўкі пратэсту ў Верхняй Сілезіі, Дамброўскім, Краківскім і нафтавых басэйнах 1 і 2 сакавіка. **Рэзалюцыйная прафапазыцыя высунула лёзунг усеагульнай забастоўкі супроць новага наступленьня прадпрыемцаў, супроць атакі на сацыяльнае страхаваньне, супроць урэзкі зарплаты і масавых звальненьняў.**

Пабудован буйнейшы ў сьвеце завод цяжкага машынабудаў ніцтва

СЬВЯРДЛОЎСК. Пад Сьвярдлоўскам на Урале пабудован **уральскі завод цяжкага машынабудаўніцтва,** які зьяўляецца буйнейшым у сьвеце. Завод штогод будзе выпускаць больш 100 тыс. тон розных машын. Па тэхнічнай насычанасьці і абсталяваньні на вейшымі мэханізмамі з уральскім машынабудаўнічым заводам ня можа раўнацца нават славуты завод Круппа.

Уральскі машынабудаўнічы завод будаваўся 5 год і прадстаўляе сабой грандыёзнае прадпрыемства. Адзін толькі мэханічны цэх займае плошчу ў 55 тыс. квадратных мэтраў (кубатура—больш 1 млн. кбм.) і **ня мае сабе роўных ні ў Эўропе, ні ў Амэрыцы.** Штогодная яго прадукцыйнасьць 50-60 тысяч тон абсталяваньня. У ім устаноўлена 455 розных варштатаў і 52 маставых краны грузападымальнасьцю ад 5 да 75 тон. Цэх разьлічан на ўнівэрсальную вытворчасьць: ён можа выраблiць любыя буйныя машыны. У мэханічным цэху устаноўлен самы буйны ў СССР прадольна-стругальны варштат. Такіх варштатаў налічваецца ва ўсім сьвеце **толькі 2.** У цэху будзе занята 3 тыс. чал.

Ужо ў бягучым годзе ўральскі завод павінен выпусьціць рад новых для СССР машын. (ТАСС).

ЛІСТ МАКСІМА ГОРКАГА Ў „КОМСОМОЛЬСКУЮ ПРАВДУ"

МАСКВА, 14. МАКСІМ ГОРКІ зьвярнуўся да рэдакцыі «Комсомольскай правды» і да камсамолу з наступным лістом:

«Комсомольская правда» заклікае ўсесаюзную моладзь на вайну супроць пустазельля. Гэта сур'ёзнейшая справа, і пачынаючы ня камсамол яшчэ раз унушліва гаворыць аб сваім культурным росьце, аб сваёй палітычнай сьпеласьці. У краіне, дзе абвешчана і пасьляхова разьвіваецца бязьлітасная барацьба, «барацьба на зьнішчэньне» двуногіх драпежнікаў і паразытаў пралетарыяту, будаўніка новага сьвету. Зусім плянамерна і натуральна пачаць цяжкую справу — зьнішчэньне шкоднікаў расьліннага сьвету, зьнішчэньня паразытаў, якія засьмечваюць, атручваюць і палядаюць вялізарную колькасьць працоўнага хлеба. Напэўна сьледам за ўсесаюзным паходам супроць пустазельля будзе абвешчана барацьба супроць пацукоў і іншых грызуноў, якія зьнішчаюць вялізарную колькасьць збожжа і харчовых прадуктаў. Ёсьць у працоўнага чалавецтва ня мала ворагаў у сьвеце казюлак і ў сьвеце мікраарганізмаў. Гэтыя шкоднікі здароўя таксама павінны быць зьнішчаны.

Так, перад несакрушальнай і ўсё ўзрастаючай энэргіяй маладой клясы, закліканой гісторыяй ачысьціць зямлю ад паразытаў, паўстаюць усё новыя баявыя задачы выхаваньня, пашырэньня і паглыбленьня волі клясы па стварэньні новых умоў сацыяльнага жыцьця, новай культуры. Чым вышэй, чым больш ясна і цьвёрда пастаўлена мэта, тым больш шпарка ідзе рост розуму і волі дзяюх сіл, якія ў моцным аб'яднаньні перамагаюць усе перашкоды па шляху да мэты, як у гэтым пераконваюць нас 15 год зьдзіўляючай работы кампартыі, створанай рабочаю клясаю, арганізацыйнага цэнтру, розуму і волі пралетарыяту.

Мае прыяцельскія пажаданьні камсамолу вельмі кароткія — **БОЛЬШ УВАГІ НАВУЦЫ.** У справе барацьбы пралетарыяту за ўладу над сьветам—навука самая вострая і магутная зброя. А таму я, зразумела, усім сэрцам жадаю вам, таварышы, поўнага посьпеху ў пачатай вамі сур'ёзнейшай рабоце і веру ў яе посьпех.

М. ГОРКІ.

Паведамленьні

—16 лютага, у 6 гадз. вечара, у шам. каркому КП(б)Б (пакой № 22) адбудзецца нарада трыкупнікаў наступных прадпрыемстваў: вав. імя Молатава, «Чырвоны Золак», «Камунарка», «Беларусь», «Пралетары», малочных кіслот, шчаціннай фабрыкі, імя Крупскай, мясакамбінату, малочны завод. Выклікаюцца прадстаўнікі Наркамснабу і Наркамлесу. Выпішпакаваныя асобы павінны зьявіцца з усімі матар'ямі аб выкананьні прамфінпляну за студзень і першую дэкаду лютага. Яўка без спазьненьня.

20-га лютага адкрываецца пленум ЦК ДКА ЦК ЛКСМБ з парадкам дня:

1. Зьмест работы піянэрскай арганізацыі і ўдарніцтва піянэраў і вучняў у вучобе.

2. Аб умацаваньні вясковай піянэрскай арганізацыі.

На пленум выклікаюцца ўсе старшыні РВ ДКА, важатыя атрадаў і бая па разасланай разьвёрстцы.

ЦБ ДКА ЦК ЛКСМБ.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА

Менскага Гарадзкога Савету Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў

3 лютага 1933 г. № 75 гор. Менск.

Аб ачыстцы вуліц, тратуараў і стрэх ад сьнегу

Менскі Гарадзкі Савет Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Абавязаць усе ЖАК'ты, даяржаўныя ўстановы, грамадзкія арганізацыі, арэндатараў і ўласьнікаў будынкаў і незабудаваных зямельных вучасткаў у горадзе Менску, штодзенна да 8-мі гадзін раніцы чысьціць тратуары, вуліцы і рынкі ад сьнегу і лёду і **кожны дзень пасыпаць тратуары пяском,** прарубіць рынкі і ўвесь пухкі сьнег на вуліцах і плошчах зграбсьці ў кучы і вывезьці ў адведныя мясцы, паказаныя ў п. 8.

УВАГА: Сьнег і лёд з вуліц і тратуараў павінен ачышчацца так, каб пры ачыстцы яго не псаваўся тратуар або брук. Сурова забараняецца скольваць сьнег і лёд на тратуарах і клінкерных маставых ламамі, кіркамі сякерамі і інш. вострымі прыладамі.

2. У выпадку паданьня сьнегу на працягу ўсяго дня, ачыстка тратуараў і зьмятаньне пухкага сьнегу з вуліц і плошчаў робіцца па некалькі разоў у дзень з такім разьлікам, каб гэта не перашкаджала вулічнаму руху.

3. Сабраныя кучы сьнегу і лёду вывозяцца на працягу сутак у наступныя мясцы звалак:

а) каля калгасу „Адраджэньне (раён Кальварыя);
б) „ „ імя Даяржынскага (Малая Сьляпянка);
в) „ „ імя ЦВК (Лошыца);
г) каля арцелі „Агароднік" (Тры Карчмы);
д) „ „Свабода" (Пярэспа);
е) „ „Чырвоная зорка" (в. Сталовая).

4. Абавязаць домакіраўніцтвы сачыць за ачысткай сьнегу і лёду накрывак пажарных студняў, гарадзкога водаправоду, каналізацыі і АТС, якія знаходзяцца на ірылягаючых да іх дамаўладаньняў вуліцах.

5. З падыходам поўнага веснавога раставаньня сьнегу, лёд на забрукаваных вуліцах павінен ськладацца і вывозіцца парадкам паказаным у п. п. 1 і 3 гэтай абавязковай пастановы.

6. Абавязаць трэст зялёных насаджэньняў штодзенна ачышчаць ад сьнегу сьцежкі, лясьніцы і лаўкі на сквэрах, пасыпаючы пяском сьцежкі і лесьніцы.

7. З падыходам вясны, сьнег і лёд са стрэх павінен быць скінуты з захаваньнем наступных мер перасьцярогі:

а) тратуары і вуліцы перад дамамі павінны быць загароджаны;

б) скідаць сьнег трэба такім парадкам, каб папярэдзіць пашкоджаньне электрычных, тэлеграфных і тэлефонных правадоў і вулічных ліхтароў.

Увага: У выпадку папсаваньня правадоў і ліхтароў домакіраўніцтвы будуць падлягаць арэшту штрафу (п. 9) апла це ўсяго кошту зробленых папсаваньняў.

в) ачыстка стрэх робіцца раніцою і павінна быць скончана да 10 гадз., а скінуты сьнег і лёд—вывезены ў парадку, паказаным у п. 3 гэтай пастановы.

8. Нагляд за выкананьнем гэтай абавязковай пастановы ўскладаецца на РС Міліцыю.

9. Асобы вінаватыя ў невыкананьні гэтай абавязковай пастановы падлягаюць адказнасьці ў адміністрацыйным парадку—штрафу да 100 руб., або прымусовым работам да 15 дзён.

10. Гэта абавязковая пастанова набывае моц з дня апублікаваньня.

Старшыня Менскага Гарадзкога Савету **ВАЛОДЗЬКА.**

За сакратара Менгарсавету **ЯГОЎДЗІН.**

Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі | СЭКТАР КНІГАГАНДЛЮ

Да ведама ўсіх ГК, РК і ячэек КП(б)Б

ВЫШЛІ З ДРУКУ

і рассылаюцца на месцы праз філіялы і кнігарні ДВБ і спажыўкаапэрацыі

1. **БЛЁК-НОТ АГІТАТАРА № 1-2 (16-17)**
Вынікі аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б)) (Агіт. мас. аддзел ЦК КП(б)Б). **Цана 30 коп.**

2. **БЛЁК-НОТ АГІТАТАРА № 3 (18)**
Усямерна ўзмацніць калгасны лад—задача шэфскіх арганізацый (Агітмасаддзел ЦК КП(б)Б. **Цана 15 к.**

3. **БЛЁК-НОТ АГІТАТАРА № 4 (19)**
XV гадавіна РСЧА (Агітмасаддзел ЦК КП(б)Б. **Цана 15 коп.**

СЭКТАР КНІГАГАНДЛЮ ДВБ.

Чырв. Зорка — Касса—ад 1 г. дня — Лепшы мастацкі фільм **Бліскучая кар'ера** Зьыш прагр. хроніка Саюзкіно

Інтэрнацыянал — Касса—ад 12 г. дня — Мастацкі фільм **КАЛАМУТА** Кіно-хроніка Саюзкіно

Кіно ПРАЛЕТАРЫ — 1) Мастацкі фільм **СПАРТАК** (правадыр гладыятараў) 2) Кіно-хроніка Саюзкіно — Дзённыя дзіцячыя сэансы **1) ЧАЛАВЕК У ФУТЛЯРЫ** 2) Кіно-хроніка Саюзкіно

СПАРТАК — Касса—ад 1 г. дня — Новы мастацкі фільм **СУДЗЬДЗЯ РЭЙТОН** Драма ў 6 частках

ТРЭСТУ БЕЛДЗЯРЖКІНО

ПАТРЭБНЫ

на сталую працу

МАШЫНІСТКІ

Зварачацца: Менск, Савецкая, 90 з 2-х гадз. дня

Праўленьне МГРК

АБВЯШЧАЕ

з 15 па 28 лютага г. г.

перарэгістрацыю усіх талёнаў,

якія ёсьць на руках у пайшчыкаў па папярэдняй падпісцы 1930, 31 і 32 г. г.

Парадак перарэгістрацыі:

1. Калгаспюро сабірае ў пайшчыкаў свайго калектыву ўсе талёны, заносіць іх у ведамасьць, згодна разасланай формы, і праводзіць калектыўн. перарэгістрацыю апошніх у праўленьні МГРК штодзенна з 12 да 3 і з 7 да 9 гадз. вечара.

2. Пайшчыкі, якія не перарэгістравалі сваіх талёнаў калектыўна павінны перарэгістравацьіх індывідуальна, пачынаючы з **23 па 28 лютага** штодзенна з 12 да 3 гадз. дня і з 7 да 9 гадз. вечара, у памяшканьні праўленьня МГРК, Савецкая, 43, пакой 4.

Неперарэгістраваныя талёны да паказанага тэрміну будуць лічыцца неапраўднымі для атрыманьня па іх тавараў.

ПРАЎЛЕНЬНЕ.

ВЫДЗЕЦЦА ЗЬЯЗ ЗДА

ПАТРЭБЕН

ГАЛОЎНЫ БУХГАЛЬТАР.

ЗВАРАЧАЦЦА: Савецкая, 63, 2-гі паверх

УЗМАЦНІМ АБАРОНАЗДОЛЬНАСЬЦЬ СССР.

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ | СЭКТАР КНІГАГАНДЛЮ

ЛІТАРАТУРА

Да XV гадавіны РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

Выданьні Дзяржаўнага Ваеннага Выдавецтва Беларусі (ДзВВБ) і Дзяржаўнага Выдавецтва Беларусі (ДзВБ)

для папаўненьня бібліятэк—гарадзкіх і раённых, клюбаў, ленінуткоў, хат-чытальняў, калгасаў і саўгасаў для нуткой абароны, габінэтаў абароны і ячэек Асоавіяхіму, а таксама для начскладу Ч. А. і чырвонаармейцаў

(П Р А Ц Я Г *)

*) ТСА—апора мірнай працы і абароны СССР.

III. Вайсковая работа сярод насельніцтва

АСОАВІЯХІМАЎСКАЯ ЛІТАРАТУРА. МАСАВАЯ ВАЙСКОВАЯ РАБОТА. ВАЙСКОВАЯ СПРАВА Ў ШКОЛЕ.

АКОДУС Я. — Будзь гатоў да санітарнай абароны. 1931 г. Ц. 20 к.

ВЕРЫЧАЎ. — Процігаз «БН». 1933 г., Ц. 25 к.

ІНСТРУКЦЫЯ ЯЧЭЙКАМ АСОАВІЯХІМУ. — Аб правядзеньні АСО 1933 г. Ц. 15 к.

VII УСЕСАЮЗНАЯ ЛЁТАРЭЯ АСОАВІЯХІМУ. — Тэзісы для дакладчыкаў. 1933 г. Ц. 15 к.

КАНАНОК А. І. — Ахова жывёлы ад атручваючых матэрый. 1932 г. Ц. 20 к.

МАТАР'ЯЛЫ Д ПЛЕНУМУ ЦЭНТРАЛЬНАГА САВЕТУ АСОАВІЯХІМУ БССР. 1932 г. Ц. 30 к.

ПАЛАЖЭНЬНЕ АБ ЯЧЭЙЦЫ АСОАВІЯХІМУ. Асоавіяхім — апора мірнай працы і абароны СССР. 1932 г. Ц. 15 к.

ХАМІЛІС І. — Што павінен ведаць працоўны аб супрацьпаветранай абароне 1932 г. Ц. 20 к

СОКАЛАЎ В. — Ваенная работа паліт асьветустанноў на вёсцы. 1932 г. Ц. 45 к.

СЯМКОЎ Б. — Хата-чытальня ў часе вопытнай мабілізацыі. 1932 г. Ц. 75 к.

ШНЭЙДЭР Р. і СОКАЛАВА Н — Школа ў часе вопытнай мабілізацыі 1932 год. Ц. 40 к.

АРЦЭЗА В. і НОВІКАЎ А. — Ваенная падрыхтоўка. Падручнік для ВНУ па праграме вышэйшай дапрызыўнай падрыхтоўкі. 1932 г. Ц. 2 р. 50 к

АРЦЭЗА В. — Ваенная справа. Падручнік па ваенных прадметах для тэхнікумаў, рабфакаў, школ ФЗС, прафшкол і старэйшага канцэнтру сямігодкі 1932-33 г. Ц. 1 р. 75 к., пер. 25 к.

ПРАГРАМА ВАЕННАЙ ПАДРЫХТОЎКІ ДЛЯ ФЗС І ШКМ. 1932 г. Ц. 45 к.

ДРУКУЮЦЦА:

ДАПРЫЗЫЎНАЯ ПАДРЫХТОЎКА АСОАВІЯХІМУ. Арк. 4.

ХАЦКЕВІЧ А. З. — Становішча і задачы чырвонакрыжных арганізацый БССР. Арк. 3.

ЭЙДЭМАН — Вынікі і далейшыя задачы работы Асоавіяхіму. Арк. 1.

ФІЗКУЛЬТУРА І СПОРТ (агульная).

АНТЫПАЎ Н. К. — Сусьветная спартакіяда — сьвята перамогі пацыёдкі. 1932 г. Ц. 20 к.

ГЕРКАН Л. — Зімовы спорт і забавы. 1931 г. Ц. 20 к.

ГІМНАСТЫКА. — Сэрыя матар'ялаў у дапамогу калектыву фізычнай культуры. 1932 г. Ц. 90 к.

ЕЙЧЫН Д. і ЦЭЙТЛІН Л. — Фізкультура на новым шляху і задачы кам самоду. 1931 г. Ц. 27 к.

СІЗЫ Е. Я. — Масавая работа ў калектыве фізычнай культуры. 1932 г. Ц. 45 к.

СІЗЫ Е. Я. і КРУГЛОЎ А. В. — Навучальна-мэтадычная работа ў калектыве фізкультуры. 1932 г. Ц. 50 к.

ПАРФІРЫДАЎ В., ГОЛЬДБЭРГ А. і ЛЕБЕДЗЕЎ В. — Цяжкая атлетыка. 1932 г. Ц. 55 к.

ЯК ЗДАЦЬ ІСПЫТЫ НА ЗНАЧОК «ГАТОЎ ДА ПРАЦЫ І АБАРОНЫ». Пад ручнік для фізкультурнікаў, якія здаюць іспыты на значок 1932 г. Ц. 80 к.

ДРУКУЮЦЦА:

СЬНЕГАЎ — Элемэнты ваяніцы ў калектыўнай фізкультуры. Арк. 2.5.

ТАРАСАЎ-КІСЬЛІНСКІ — Лыжная справа ў СССР. Арк. 10.

СТРАЛКОВЫ СПОРТ.

КРЫМАЎ Л. — Праграма і канспэкт—чытальнік па стралковай падрыхтоўцы. 1932 г. Ц 25 к.

МАРОЗАЎ Г. — Падрыхтоўка добрага баявога стралка (дапаможнік для інструктароў). 1931 г. Ц. 50 к.

СОНЦАЎ В. — Арганізацыйна-мэтадычныя (казаньні да праграмы пачатковага навучаньня (Накаротку). 1932 г. Ц. 20 к.

АЛКАЛАЕЎ. — Стралковы спорт. Арк. 6 (друкуецца).

IV. Мастацкая літаратура

ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ І ГРАМАДЗЯНСКАЯ ВАЙНА Ў МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ.

АЛЕКСАНДРОВІЧ А. — Нараджэньне чалавека. Вершаваны роман. 1932 г. Ц. 1 р. 30 к

АЎЧАРЭНКА І. — У агнявым кругу. 1932 г. Ц. 80 к.

БАБУНАЎ А. — Прарыў. 1932 г. Ц. 65 к.

БЕЛЛАЧАФ. — Зборнік І. 1931 г. Ц. 60 к.

БЯЛІНА-ПАДГАЕЦКІ Н. — Кулямёт (Апавяданьні, нарысы, успаміны). 1931 год. Ц. 85 к.

ВИННЕЎСКІ Ў. С.—Першая Конная. (П'еса). 1932 г. Ц. 1 р.

ГАРНІЧ Н. — Восемнаццаты. (Вольны пераклад з рускай мовы). 1932 г. Ц. 2 р. 40 к.

ГОРАЎ Л. — Бронепаязнік у агні (Апавяданьне). 1931 г. Ц. 20 к.

ЗАРЭЦКІ Міхась. — Бацькаў сын (Апавяданьне). (Б-ка для малапісьменных). 1932 г. Ц. 15 к.

ЗВОНАК Алесь — Загай (Паэма). 1931 г. Ц. 1 р.

ІВА Станіслаў. — Чырвонаштандарная. 1930 г. Ц. 35 к.

ІСВАХ. — Са стрэльбай і кнігаю. (Чырвонаармейскія буднi). 1928 г. Ц. 30 к.

КАЗАК Рыгор. — Паэзія чырвонаармейца. 1931 г. Ц. 50 к.

КАЛЬЦОЎ МІХ. — Зьвёзданосцы. 1931 год Ц. 40 к.

КАЛЬЦОЎ МІХ. — Хачу лятаць 1932 г Ц. 70 к.

КЛЮЕЎ Л. — Першая Конная Армія. 1930 г. Ц. 15 к.

КОСТАРАЎ М. — Замкнёная грані ца.. З жыцьця Далёка-Ўсходняй арміі 1931 г. Ц. 65 к.

ЛАЎРЭНЕЎ Б. — Сорак першы. 1931 год. Ц. 45 к.

ЛЕБЯДЗІНСКІ Ю. — Камісары 1930 год. Ц. 1 р. 15 к.

ЛЫНЬКОЎ Міхась. — Андрэй Ляпуш (выд. II). 1932 г. Ц. 1 р. (Апавяданьне «Над Бугам»).

СЕРАФІМОВІЧ А. — Жалезны паток. 1930 г. Ц. 1 р.

СТАШЭЎСКІ В. — Рытмы перамогі. З эпохі вызваленьня Беларусі ад белапалякаў. 1931 г. Ц. 1 р.

УТКІН І.—Вайна і мір. Вершы. 1932 год. Ц. 1 р. 25 к.

ФАДЗЕЕЎ А. — Разгром. 1930 г. Ц. 1 р. 10 к.

ФУРМАНАЎ Д. — Канец Чапаева. 1930 г. Ц. 25 к.

ФУРМАНАЎ Д. — Мяцеж (П'еса). 1930 г. Ц. 95 к.

ФУРМАНАЎ Д. — У восемнаццатым годзе. 1930 г. Ц 35 к.

ФУРМАНАЎ Д. — Чапаеў. 1930 г. Ц. 2 р. 10 к.

ФУРМАНАЎ Д. — Чырвоны дэсант. 1929 г. Ц. 20 к.

ХВЕДАРОВІЧ М — Вайна за мір. (Вершы). 1932 г. Ц. 1 р. 50 к., пер. 50 к.

ЧЫБІСАЎ І. Аповесьць аб «Стралку». (Запіскі рэдактара палковай шматыражкі). 1931 г. Ц. 15 к.

ШАПОВАЛОВ ИВАН. — «Товарищ». Стихи. (На рускай мове). 1932 г. Ц. 90 к., пер. 10 к.

ЯКАЎЛЕЎ В. — Салют крэйсэра «Камінтэрн». 1932 г. Ц. 22 к.

ДРУКУЮЦЦА:

ГОДЫНЭР. — Чалавек з вінтоўкай. (З яўр. мовы). Арк 10½.

ПІХАНАЎ М. — Вайна (роман). Арк. 7½.

У ЦАРСКАЙ КАЗАРМЕ.

БАБУШКІН В. У царскіх пагонах. 1930 г. Ц. 40 к.

ГРОМАЎ М. — Па крыжы. 1931 г. Ц. 80 к.

ГРОМАЎ М. — У царскай казарме. 1930 г. Ц. 18 к.

ОСЬКІН Д. — Запіскі салдата. 1931 г. Ц. 76 к.

*) Пачатак (разьдзелы): I—Палітычная літ-ра і II—Ваенная літ-ра)— глядзі газ. „Зьвязда" № 36 за 15-II—1933 г.

ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНАЯ ВАЙНА. АРМІЯ КАПІТАЛІСТЫЧНЫХ КРАІН.

ГАШЭК Я.—Прыгоды ўдалага вояка Швейка, ч. І. 1931 г. Ц. 1 р. 10 к.

ГАШЭК Я. — Прыгоды ўдалага вояка Швейка, ч. II. 1931 г. Ц. 1 р. 15 к.

ГАШЭК Я. — Прыгоды ўдалага вояка Швейка, ч. III. 1932 г. Ц. 1 р. 20 к.

ГАШЭК Я. — Прыгоды ўдалага вояка Швейка, ч. IV. 1932 г. Ц. 1 р. 20 к.

ВАНЭК Кароль. — Прыгоды ўдалага вояка Швейка, ч. V. 1932 г. Ц. 1 р. 10 к.

ВАНЭК Кароль. — Прыгоды ўдалага вояка Швейка, ч. VI 1931 г. Ц. 90 к.

ГАШЭК Я. — Швейк за дзяцінчыка ў фельшкурата. (Выд. II). 1932 г. Ц. 50 к. (Таксама выданьне III — друкуецца).

ГАШЭК Я. Швейк на фронце. 1931 г Ц. 25 к.

РЭМАРК Эрых-Марыя. — На заходнім фронце без перамен. 1931 г. Ц. 1 р. 10 к.

ВАЕННАЯ ФАНТАСТЫКА (мастацкая літаратура).

БУДАНЦОЎ. — Эскадрыльля сусьветнай камуны 1930 г. Ц. 12 к.

ГЕЛЬДЭРС,—маёр. Паветраная вайна 1936 г. Зруйнаваньне Парыжу. (Роман). 1932 г. Ц. 1 р. 50 к.

УЭЛЬС Г. — Вайна ў паветры. (Фантастычны роман). 1931 г Ц. 1 р. 40 к.

НОТЫ.

АЛАДАЎ М. — Чырвонаармейская паходная «Ціха, таварышы». 1932 г. Ц. 45 к.

ТУРАНКОЎ А. — Песьня маракоў. (Для голасу або хору в фортэп'яно). 1932 год. Ц. 30 к.

ТУРАНКОЎ А. — У паход! (Для голасу з фортэп'яно). 1932 г. Ц. 35 к.

ЯФІМАЎ В. — Сьмела уперад! (Словы Андрея Александровіча). Чырвонаармейская песьня. 1931 г. Ц. 20 к.

ВАЙНГАУЗ. — На варце. Чырвонаармейскія нарысы. (Нацсэктар ДВБ). 1932 год. Ц. 90 к.

ВЭВЕРКА І ЛЕВІН. — Абарона. (Зборнік). (Укр. ЦВН). 1931 г. Ц. 12 к.

ВЕСЯЛОЎСКІ. — Японія і яе ўзброеныя сілы. (Нацсэктар ДВБ) 1932 г. Ц. 50 к.

ВНУКАЎ. — Ці страшна нам ваенная тэхніка? (Вскладзе. ЦВН). 1931 г. Ц. 20 к.

КАЛЬЦОЎ Міх. — Зьвёзданосцы. (Нацсэктар ДВБ) 1932 г. Ц. 30 к.

ЛІПМАН. — На манчжурскім фронце. (Нарысы). 1931 г. Ц. 50 к.

МЯШЧЫНСКІ Э. — Як абараняцца ад шаматрана-хімічнага нападу. («Эмес») 1932 г. Ц. 75 к.

СТАТУТ аб ячэйцы Асоавіяхіму (ЦО Асоавіяхіму СССР). 1932 г. Ц. 15 к.

СЯМАШКА М. — Даеш савецкі дырыжабль! (ЦВН — Масква). 1931 г. Ц. 03 к.

ХАРЫТОНАЎ. — Рабочы правадыр Клім Варашылаў. (ЦВН — Масква)

ХАШЧАВАЦКІ. — Перакоп. Да X гадавіны. (Зборнік). (Укр. ЦВН). 1931 г. Ц. 15 к.

ХОРЫКАЎ. — Як пабудовай і як працуе кулямёт Дзегцярова («Эмес»). 1932 год. Ц. 23 к.

ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ. Зборнік ўдарэйскай секцыі БЕЛЛАЧАФУ. (Нацсэктар ДВБ). 1932 г. Ц. 1 р. 55 к.

ДРУКУЮЦЦА (Нацсэктар ДВБ).

КАДЗІШАЎ — Небясьпека вайны і задача абароны СССР. Арк. 4½.

КІРЫЕНКА. Кітайская Чырвоная армія. Арк. 5.

ФЕДАРАЎ. Дэгазацыя. Арк. 2.

ДЗЕЦЯМ АБ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ.

СЬМІРНОЎ — На што нам патрэбна Чырвоная армія. (Выд. «Школа і кніга»). 1927 г. Ц. 35 к.

ЗАБАЙКАЛЬСКІ В. — Маленькія чырвонаармейцы. (Бел. адд. ЦВН). 1931 г. Ц. 65 к.

б) НА ПОЛЬСКАЙ МОВЕ:

УРАЛЬЦАЎ — Чырвоная армія сёньня. (Нацсэктар ДВБ). Ц. 30 к.

БОГЕН. — Жанчына баец Чырвонай арміі. (Нацсэктар ДВБ). 1932 г. Ц. 15 к.

ВНУКАЎ. Ці страшна нам ваенная тэхніка (Нацсэктар ДВБ). 1931 г. Ц. 20 к.

ЗАРЗАР В. Пабудуем савецкі дырыжабль! (Укр. Нацменыд). 1932 г. Ц. 15 к.

КАДЗІШАЎ. — Небясьпека вайны і задача абароны СССР. (Партвыдат — Масква). 1932 г. Ц. 20 к.

СОХАЦКІ. — Польскі сацыял-фашызм і інтэрвэнцыя супроць СССР. Ц. 20 к.

ЛЯС Міхаіл. — Вайна над маскам разобраньня. (Партвыдат — Масква). 1932 г. Ц. 65 к.

ДАШЫНСКІ. — Японія ў Манчжурыі. (Партвыдат — Масква).

ЯН-ЧЖУ-ЛАЙ. — Японскія імпэрыялісты ў Шанхаі. (Партвыдат — Масква). 1932 г. Ц. 35 к.

в) НА ЛІТОЎСКАЙ МОВЕ

УРАЛЬЦАЎ — Чырвоная армія сёньня. (Нацсэктар ДВБ). Ц. 30 к.

**ВАЕННА-АБАРОН